ВЕРА,
«ТЫ СУПЕР!»

НА ШОПІНГ
ДА... СМЕТНІЦ

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 ЧЭРВЕНЯ 2018 г. ЧАЦВЕР № 107 (28723)

Перад экзаменам

Выпускнікі Глыбоцкай сярэдняй школы № 2 Насця ТУМЧАНОК і Максім ЦІТОЎ.

Фота БелТА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ІСАЧАНКА, старшыня Мінаблвыканкама:

«У цэлым колькасць зваротаў грамадзян знаходзіцца прыкладна на адным узроўні. Як заўсёды, уздымаюцца пытанні зямельных адносін, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, жылля. А вось пытанняў па працаўладкаванні апошнім часам стала менш. Цяпер па вялікім рахунку больш звяртаюцца кіраўнікі прадпрыемстваў і гаспадарак — не хапае кваліфікаваных рабочых. Гэта і «БелДжы», і «Амкадор», і іншыя буйныя прадпрыемствы».

КАРАТКА

• Беларусь прыцягне ў 2018—2021 гадах пазыку Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця да 5 млн еўра тэрмінам на 15 гадоў для будаўніцтва новага рэгіянальнага палігона цвёрдых камунальных адходаў і мадэрнізацыі сістэм збору адходаў у Пухавіцкім і Чэрвеньскім раёнах. Адпаведны Указ № 217 падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

• **«Олдтаймер-ралі» дзясяты раз пройдзе ў Мінску 9—10 чэрвеня. У мерапрыемстве прымуць удзел больш за 50 экіпажаў з Беларусі і Расіі. Усе аўтарарытэты выпушчаныя да 1980 года, многія з іх прадстаўлены ў Беларусі ў адзіным экзэмпляры. 9 чэрвеня каля Палаца Рэспублікі з 13.30 да 18.00 экіпажы прадставяць свае аўто ў адпаведным гістарычным стылі, касцюмах і традыцыях.**

• Першы міністр замежных спраў Беларусі Пётр Краўчанка ўзнагароджаны найвышэйшым ордэнам Італіі для замежнікаў — Зоркай Італіі.

■ Фестывалім

НА КУПАЛЛЕ Ў АЛЕКСАНДРЫЮ

Фота БелТА.

Праз месяц, 7—8 ліпеня, рэспубліканскі фестываль «Купалле» чарговы раз збярэ сяброў на маляўнічым лузе каля аграгарадка Александрыя. Свята пачнецца ў суботу і будзе доўжыцца амаль без перапынку да позняга вечара нядзелі.

СТАР. 3

■ Рэпарцёр

«Увага: цягнік адпраўляецца»

Як падтрымліваюць бяспеку на чыгунцы

Без асаблівай патрэбы ў другой палове дня ў пятніцу каля вакзала лепш не з'яўляцца: знясуць! Бабулі ў рознакаляровых капелюшах і панамах адпраўляюцца на праполку агарода, групкі падлеткаў мараць адпачыць без бацькоўскага кантролю на дачы, студэнты на выхадныя едуць зноў пад утульнае маміна крыло, турысты спрабуюць зразумець, куды браць кірунак, каб убачыць усю прыгажосць беларускай зямлі. Сцэнарыяў шмат! Здаецца, менавіта ў цягніках і электрычках у гэты час сканцэнтравана сапраўднае жыццё...

САМАЕ АЖЫЎЛЕНАЕ МЕСЦА Ў ГОРАДЗЕ

З аднаго боку, гэта цудоўна. Дзе яшчэ ўбачыш такую разнастайнасць людскіх тыпажоў? З другога — там, дзе збіраецца натоўп, заўсёды павышаецца рызыка разнастайных здарэнняў. Таму вакзалам і цягнікам удзяляецца асаблівая ўвага з боку міліцыі. Толькі ўявіце: за дзень праз станцыю Мінск — Пасажырскі праходзіць каля 100 пар цягнікоў. Парамі яны лічацца, бо ідуць у абодва бакі. Калі ёсць цягнік Мінск — Гродна, то абавязкова будзе і яго дублёр па тым жа маршруце ў зваротным кірунку — Гродна — Мінск. Дарэчы, пасажырапаток сотні цягнікоў — каля 100 тысяч! І гэта без уліку тых, хто іх сустракае і праводзіць, хто праз тэрыторыю вакзала ідзе да гандлёвых цэнтраў або прыязджае спецыяльна, каб купіць свежыя кветкі ў падземным пераходзе.

СТАР. 13

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

НЯСУМНАЕ ЛЕТА З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Вы гарантуеце сабе і сваім блізкім, аформіўшы падпіску на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Заставайцеся з намі — будзе цікава!

ISSN 1990 - 763X

■ Геапалітыка

ВЫЙГРАЕМ ЗА КОШТ ІНТЭГРАЦЫІ

У хуткім часе распачнецца афіцыйны візіт кіраўніка нашай дзяржавы ў кітайскі Цындаа, дзе адбудзецца саміт Шанхайскай арганізацыі супрацоўніцтва. На яго палях плануецца сустрэча Аляксандра Лукашэнкі са старшынёй КНР Сі Цзіньпінам. Да гэтага ў беларускую сталіцу завітаў намеснік старшыні Кітайскай Народнай Рэспублікі Ван Цішань. Чаму зараз назіраецца такая актывізацыя кантактаў і чым гэта карысна для абодвух бакоў? Пра гэта «Звяздзе» расказала Вольга КУЛАЙ, аналітык Цэнтра стратэгічных і знешнепалітычных даследаванняў, аўтар-удзельнік «Мінскага барометра».

— Як статус назіральніка Беларусі ў ШАС уплывае на беларуска-кітайскія адносіны?

— Ён дазваляе ўдзельнічаць у сустрэчах найвышэйшага і высокага ўзроўню арганізацыі. Для Беларусі ШАС — гэта шматбаковая пляцоўка, якая дазваляе акрамя ўдзелу ў мерапрыемствах парадку дня арганізацыі таксама прадоўжыць дыялог з нашымі партнёрамі — Расіяй, Кітаем і іншымі.

Зараз КНР актыўна прасоўвае ініцыятыву «Адзін пояс і адзін шлях» і задзейнічае для гэтага ў тым ліку і ШАС. А для нас гэта магчымасць прапанаваць свае варыянты ўдзелу ў ініцыятыве.

Чарговая сустрэча кіраўнікоў Кітая і Беларусі на палях ШАС — добрая пляцоўка для таго, каб чарговы раз, ужо пасля візіту Ван Цішаня ў нашу краіну, які адбыўся на мінулым тыдні, абмеркаваць планы беларуска-кітайскага супрацоўніцтва на найбліжэйшы час.

— На дадзеным этапе заключаны кантракты з кітайскім бокам на пастаўку беларускай мяса-малочнай прадукцыі, чакаецца іх рэалізацыя. Але аб'ёмы пакуль не ўражваюць...

— Бо мы толькі намацоўваем магчымыя варыянты пашырэння экспарту. Тут важна разумець, што традыцыйным нашым партнёрам з'яўляецца Расія, а не Кітай. Ідэя экспарту сельгаспрадукцыі ў КНР распрацоўвалася даўно, і затрымку ў з'яўленні кантрактаў можна растлумачыць тым, што шмат часу пайшло на тое, каб зразумець, як гэты рынак працуе. Ды і ўваход на яго выклікаў складанасці, бо на ім спецыфіка адрозная ад нашай. Час пайшоў і на пошук партнёраў.

Далей больш эфектыўным крокам можа стаць стварэнне сумесных кампаній з кітайскімі партнёрамі па экспарце нашай прадукцыі на рынак КНР. Гэта асноўная мадэль, па якой дзейнічаюць і заходнія краіны для ўваходжання на кітайскі рынак. Кітай таксама шмат чаго закупае, і чаму б Беларусі не стаць адной з краін-імпарцёраў, раз наша прадукцыя адпавядае патрабаванням якасці і ўвогуле мае станоўчы імідж за мяжой?

Акурат у красавіку ў Шанхаі створана сумеснае прадпрыемства, якое стане аператарам паставак беларускай прадукцыі ў Кітай. Трэба адзначыць, што і іншыя кітайскія кампаніі таксама выказалі зацікаўленасць у такім супрацоўніцтве, зараз ідуць перагаворы.

— Раз у нас так актывізаваліся беларускія пастаўкі, ці чакаць наплыву кітайскіх тавараў у Беларусь?

— Выхад на рынак Кітая беларускай прадукцыі не ўказвае на тое, што ў адказ ад КНР будуць такія ж дзеянні. У Кітая і Беларусі за апошнія дзесяцігоддзі ўжо сфарміраваліся традыцыйныя экспартныя рынкі. Калі для нас гэта Расія, то для Кітая найбуйнейшым гандлёвым партнёрам зараз з'яўляюцца ЗША. І наўрад ці гэтыя пазіцыі значна зменяцца.

Кітайскія пастаўкі змогуць павялічыцца ў тым выпадку, калі будзе расці попыт сярод беларусаў, якія вырашаць прагаласаваць рублём за кітайскія тавары. Але пакуль мы не ствараем нічога падобнага, напрыклад, на прадукцыю кампаніі Xiaomi такой жа якасці і кошту. Магчыма, у кантэксце сусветнага размеркавання вытворчасці Беларусі гэта і не трэба.

— Не думаю, што ў пастаўках мы абмяжуемся аднымі прадуктамі харчавання. А як жа тавары з высокай дабаўленай вартасцю, высокатэхналагічная прадукцыя? Час ад часу ідуць гутаркі аб стварэнні адпаведных вытворчасцяў, але пакуль канкрэтных вынікаў не відаць.

— Сапраўды, тут ёсць складанасці. Для стварэння адпаведных прадпрыемстваў, у тым ліку высокатэхналагічных, асноўнай двухбаковай пляцоўкай сёння з'яўляецца Кітайска-беларускі індустрыяльны парк «Вялікі камень». У дачыненні да яго адно з галоўных пытанняў — фінансаванне. Беларускі бок не мае магчымасці ўкласці значную суму ў будаўніцтва інфраструктуры. Зараз, каб адшукаць фінансаванне, быў створаны, напрыклад, сумесны інвестыцыйны фонд. Ідуць перагаворы з міжнароднымі фінансавымі арганізацыямі, каб зняць недахоп у фінансаванні.

Трэба разумець, што Кітай — гэта вельмі практычны інвестар. Ён паводзіць сябе часта як заходні. Каб інвестар з КНР прыйшоў у Беларусь, патрэбна больш глыбокая прапрацоўка праектаў з нашага боку. Праекты, якія прапаноўвае беларускі бок, натуральна, ствараюцца ў інтарэсах нашай краіны. Але кітайскія інвестары падчас лічаць прапрацоўку ідэй недастатковай, што не дае магчымасці ў пэўнай ступені асэнсавана прыняць рашэнне аб далейшым удзеле. Таму і некаторыя прапановы беларускага боку застаюцца без водгуку.

— Ажыўленне кантактаў, ажыццяўленне паставак, сустрэчы на высокім узроўні... Зараз беларуска-кітайскія адносіны значна актывізаваліся. Але навошта такія наладжаныя кантакты абодвум бакам?

— Па-першае, гэта заканамерны вынік двухбаковай працы нашых ведамстваў, у тым ліку пасольстваў. Па-другое, у мадэлях нашых знешніх палітык і эканомік можна пабачыць падобныя рысы. І Кітай, і мы імкнёмся да дыверсіфікацыі. Беларусь — краіна невялікая па памеры з абмежаванымі рэсурсамі, на якія мы можам абапірацца хоць бы з пункту гледжання фінансавання. Затое можам эфектыўна кіраваць тымі рэсурсамі, якія ў нас ёсць, для таго, каб прыстойна функцыянаваць на дзяржаўным узроўні. Для гэтага нам патрэбна інтэграцыя з максімальнай колькасцю структур і краін — Расіяй, Еўрапейскім саюзам, Еўразійскім эканамічным саюзам, Азіяй, Блізкім Усходам і іншымі партнёрамі.

Кітай робіць амаль тое ж самае. Ён удзельнічае ў міжнародных арганізацыях, калісьці створаных Захадам, і адначасова стварае свае інстытуты, напрыклад, Азіяцкі банк інфраструктурных інвестыцый. У КНР зараз на гэта ёсць рэсурсы, таму што яна ўжо выйшла са стадыі накаплення капіталу, распачатай у 1978 годзе, калі была абвешчана Палітыка рэформаў і адкрытасці. Праз наладжванне сувязяў з іншымі краінамі Кітай, як і Беларусь, спрабуе дыверсіфікаваць свае рызыкі.

Палітыка не можа існаваць без эканомікі. У любога палітычнага супрацоўніцтва павінен быць эканамічны падмурак, які мы паступова ствараем. Але важна памятаць, што добрымі палітычнымі адносінамі кітайскага інвестара ўкладацца не пераканаеш. Тым не менш інвестары на наш рынак прыходзяць і прапановы з'яўляюцца. Усё ж такі мы ім цікавыя. Наколькі — трэба разглядаць у кантэксце інтэграцыі Беларусі ў эканамічныя суполкі і арганізацыі (ЕАЭС, ЕС, Сусветная гандлёвая арганізацыя), а таксама беларускага ўплыву ў іх.

На дадзеным этапе беларускі МЗС праводзіць работу па нармалізацыі адносін з ЕС і магчымым падпісанні базавага пагаднення Беларусі з ЕС. Нягледзячы на санкцыі, такое пагадненне, напрыклад, існуе паміж ЕС і Расіяй. Для Кітая яго падпісанне будзе вельмі важным, бо такім чынам адкрываюцца новыя рынкі збыту. А гэта другое пасля інфраструктуры пытанне ў развіцці «Вялікага каменя». І для гэтага не патрэбна ўдзяляць менш увагі нашым адносінам з традыцыйнымі партнёрамі — і з Расіяй, і ў рамках ЕАЭС.

Вераніка ПУСТАВІТ

■

Горад Цындаа гатовы да саміту.

■ Парламенцкі дзённік

Праекты для індыйскага бізнесу

Дэлегацыя Канфедэрацыі індыйскай прамысловасці сустрэлася са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам МЯСНІКОВІЧАМ. Спікер адзначыў, што ў дзвюх краін гістарычна склаўся высокі ўзровень сяброўскіх адносін на палітычным трэку, і нагадаў пра візіт Прэзідэнта ў Нью-Дэлі, які адбыўся летась у верасні. Тады былі прыняты сур'ёзныя рашэнні і падпісаны шэраг пагадненняў, якія рэгулююць гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае супрацоўніцтва.

— Я мяркую, як куратар індыйска-беларускага супрацоўніцтва, што палітычныя і парламенцкія кантакты крыху апераджаюць намаганні дзелавых колаў. І, я думаю, што ваш візіт будзе садзейнічаць менавіта таму, каб і бізнес-супольнасці працавалі больш актыўна, — адзначыў Міхаіл Мясніковіч.

На думку старшыні Савета Рэспублікі, ёсць усё для таго, каб бізнес працаваў больш эфектыўна: палітычная воля, нарматыўна-прававое забеспячэнне і канкрэтныя праекты. На сустрэчы абмеркавалі пытанні па супрацоўніцтве ў машынабудаўнічай сферы, фармацэўтычнай прамысловасці, тэкстыльнай галіне, ваенна-тэхнічным напрамку і іншыя. «Акрамя таго, мы гатовыя адначасова вырашаць і пытанні фінансавага суправаджэння. Таварнае супрацоўніцтва падмацоўваць адпаведнымі фінансавымі схемамі», — заўважыў Міхаіл Мясніковіч.

У сустрэчы таксама ўдзельнічалі міністр прамысловасці Беларусі Віталь Воўк, старшыня БелГПП Уладзімір Улаховіч, намеснік старшыні праўлення Банка развіцця Беларусі Іван Варэніца і прадстаўнікі прадпрыемстваў. Уладзімір Улаховіч адзначыў, што «за апошнія гады гэта, напэўна, самая рэспектабельная бізнес-дэлегацыя, бо прадстаўляе найбуйнейшыя індыйскія кампаніі. Вядома, мы гэта расцэньваем як адказ на наш дзелавы форум, які праходзіў у рамках візіту Прэзідэнта. І мы разлічваем, што будуць сур'ёзныя вынікі». Напрыклад, такія чакаюцца ў развіцці сумеснага праекта ў Оршы.

Надзея АНІСОВІЧ

■

■ Меркаванні

ІНФЛЯЦЫЙНЫЯ ЧАКАННІ ЗАСТАЮЦЦА

Нацыянальны банк Беларусі апублікаваў чарговае даследаванне інфляцыйных чаканняў насельніцтва.
Са справаздачы вынікае, што ў маі беларусы адчувалі гадавую інфляцыю на ўзроўні 12,9 % (супраць 12,4 % у лютым), паведамляе фінансавы кансультант Жанна КУЛАКОВА.

Акрамя таго, прыкметна ўзрасла доля насельніцтва, якая лічыць, што ў будучыні цэны будуць расці гэтак жа інтэнсіўна, як і цяпер (64,4 % рэспандэнтаў у маі супраць 59,8 % у лютым). Пры гэтым знізілася доля рэспандэнтаў, якія чакаюць паскарэння інфляцыі (11 % у маі супраць 11,9 % у лютым) і запаволення інфляцыі (20,4 % у маі супраць 23,9 % у лютым).

Як бачым, інфляцыйныя чаканні беларусаў застаюцца высокімі, пры гэтым насельніцтва адчувае, што цэны растуць у некалькі разоў хутчэй, чым сведчыць афіцыйная статыстыка. Рост узроўню інфляцыі можа быць звязаны ў тым ліку і з тым, што інфляцыя сапраўды трохі паскорылася: калі па выніках снежня 2017 года гадавая інфляцыя склала 4,6 %, то па выніках сакавіка 2018 года — 5,4 %, па выніках красавіка — 5 %.

У кожнай сям'і адчувальны ўзровень інфляцыі залежыць ад таго, якія тавары і паслугі традыцыйна ўваходзяць у штомесячны спажывецкі кошык. Нешта даражэе хутка, нешта — не даражэе наогул. Рост узроўню інфляцыі можна звязаць у тым ліку і з паскораным ростам адміністрацыйна рэгуляваных цэн і тарыфаў. Напрыклад, жыллёва-камунальныя паслугі ў сакавіку прадэманстравалі гадавую інфляцыю на ўзроўні 18,8 %. А ЖКП — гэта якраз тыя выдаткі, якія нясе любая сям'я незалежна ад сваіх пераваг і ладу жыцця.

Дарэчы, беларусы вельмі адчувальныя да любых змен на валютным рынку, і красавіцкія ваганні валютных курсаў разам з падаражэннем долара маглі паўплываць на настрой. Таксама тут праяўляецца яшчэ адна асаблівасць менталітэту нацыі — песімізм у адносінах да працэсаў, якія адбываюцца ў эканоміцы і на фінансавым рынку.

Сяргей КУРКАЧ

■

■ Эканамікс

САМЫЯ ПАСПЯХОВЫЯ

У Мінску ўзнагародзілі прадпрыемствы за дасягненні ў галіне якасці

Пераможцаў конкурсу на саісканне прэміі ўрада Беларусі за дасягненні ў галіне якасці абіраюць ужо 19-ы раз. Прэмія лічыцца самай прэстыжнай нацыянальнай узнагародай, якая ўручаецца паспяховым арганізацыям краіны, што дасягнулі значных вынікаў у галіне якасці прадукцыі і паслуг, выкарыстоўваюць сучасныя метады менеджменту і інавацыйныя тэхналогіі.

Намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір СЯМАШКА падчас цырымоніі ўзнагароджання адзначыў, што найлепшыя кампаніі фарміруюць імідж Беларусі на ўнутраным і на міжнародным рынку. Таксама, на яго думку, разам з канкурэнтаздольнасцю якасць беларускай прадукцыі павінна адпавядаць самым высокім тэхнічным і рынкавым патрабаванням.

Прэмія ў галіне якасці прысуджаецца арганізацыям, якія вырабляюць нехарчовую прадукцыю бытавога прызначэння, харчовую і сельскагаспадарчую прадукцыю, аказваюць паслугі, выконваюць работы ў галіне будаўніцтва.

Крытэрыі, па якіх ацэньваюцца арганізацыі-ўдзельніцы, улічваюць не толькі дасягнуты ўзровень якасці і канкурэнтаздольнасці прадукцыі, экспартныя паказчыкі прадпрыемства, эфектыўнасць менеджменту, але і стварэнне ўмоў для доўгатэрміновай паспяховай працы ў канкурэнтным асяроддзі.

Сёлета камісія па прысуджэнні прэміі прыняла рашэнне аб прысваенні звання лаўрэата конкурсу шасці новым арганізацыям: лакаматыўнаму дэпо Маладзечна Мінскага аддзялення Беларукай чыгункі, Бабруйскаму заводу трактарных дэталяў і агрэгатаў, Мінскаму заводу колавых цягачоў, Навукова-практычнаму цэнтру Нацыянальнай акадэміі навук па харчаванні, Гродзенскаму абласному клінічнаму перынатальнаму цэнтру, філіялу «Энергазбыт» «Гомельэнерга».

У сваю чаргу 31 арганізацыя пацвердзіла званне лаўрэата паўторна, а тры ўдастоены спецыяльных узнагарод. Усяго за мінулы час пераможцамі сталі 219 арганізацый. Некаторыя з іх неаднаразова.

Старшыня Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Віктар НАЗАРАНКА лічыць, што трапіць у спіс найлепшых дастаткова складана: «Часта, калі прадпрыемствы спрабавалі пацвердзіць званне лаўрэата, то аказвалася, што вельмі многія з іх не змаглі таго зрабіць. Гэта тлумачыцца пагаршэннем эканомікі прадпрыемстваў, пытаннямі ўзаемадзеяння са спажыўцом, уплывам рынку. Трапіць у дадзены пул досыць складана».

Лаўрэаты прэміі, у тым ліку і тыя, што пацвердзілі гэтае званне, на працягу трох гадоў могуць выкарыстоўваць выяву эмблемы прэміі на маркіроўцы тавараў, у дакументацыі, а таксама ў рэкламных мэтах.

Ілья КРЫЖЭВІЧ

■

НА КУПАЛЛЕ Ў АЛЕКСАНДРЫЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Як адзначыў **намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Андрэй КУНЦЭВІЧ,** на свята чакаюць больш за 110 тысяч чалавек — гэта рэкордная колькасць наведвальнікаў за восем гадоў існавання фестывалю.

У праграме — выстаўкі, канцэрты, квэст-гульні, конкурсы, дыскатэкі, паказальныя выступленні спартсменаў, дэманстрацыйныя палёты самалётаў і скачкі парашутыстаў. Будзе што паглядзець і на тэматычных пляцоўках, упершыню на такім мерапрыемстве прэзентуюць аграэкасядзібы Беларусі.

У святе прымуць удзел 1,5 тысячы творчых калектываў і выканаўцаў з Беларусі, Расіі, Латвіі, Украіны, Літвы, Польшчы, Германіі. Галоўнай падзеяй, як заўсёды, стане вялікае тэатралізаванае прадстаўленне з удзелам вакальна-інструментальнага ансамбля «Сіняя птушка», Івана Вабішчэвіча, Сяргея Трафімава, Алены Ланской і іншых зорак айчыннай, расійскай і ўкраінскай эстрады. Убачыць прыгожае купальскае шоу зможа да 3,3 тысячы чалавек. Білеты, дарэчы, каштуюць 27 рублёў, іх ужо можна набыць у касах Магілёўскай абласной філармоніі або праз інтэрнэт.

Асаблівасцю сёлетняга «Купалля» стане правядзенне Дзён культуры Украіны. Гэта дасць магчымасць апынуцца на славутым «Сарочынскім кірмашы», пабачыць коннае шоу «Кіеўская Русь», паслухаць зорак украінскай эстрады Ціну Караль, Алега Вінніка, Ленару Асманаву, аўтарскі этнамузычны праект Luiku, атрымаць асалоду ад выступлення нацыянальнага заслужанага ансамбля танца Украіны імя Паўла Вірскага.

Падсілкавацца для ўдзелу ў шматлікіх конкурсах і інтэрактыўных праграмах можна будзе пры дапамозе 139 аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання. Працягласць гандлёвых радоў абяцае перавысіць кіламетр. І не забудзьце прыхапіць грошы на абноўкі і сувеніры. Удзел у святе прымаюць шматлікія прадпрыемствы, а таксама прызнаныя майстры розных краін.

Для дастаўкі ахвотных апынуцца на святе арганізуюць дадатковую колькасць грамадскага транспарту, у тым ліку чыгуначнага. Не застануцца пакрыўджанымі і аўтаўладальнікі. Да іх паслуг — вялікая аўтапаркоўка, побач з якой прадугледжаны месцы для таго, каб паставіць палатку і правесці купальскую ноч пад адкрытым небам. У начной праграме таксама шмат цікавага — прыгожы феерверк, вялікае купальскае вогнішча і дыскатэка да раніцы.

Нэлі ЗІГУЛЯ.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

ІРАН АДНАЎЛЯЕ ЯДЗЕРНУЮ ПРАГРАМУ

Тэгеран апавясціў Міжнароднае агенцтва па атамнай энергіі аб тым, што Іран пачынае працэс нарошчвання магутнасцяў па ўзбагачэнні ўрану. Пра гэта паведаміў кіраўнік Арганізацыі па атамнай энергіі Ірана Алі Акбар Салехі, перадае ТАСС. «Мы накіравалі ў МАГАТЭ ліст, у якім гаворыцца пра пачатак работ у кантэксце ядзернай праграмы, і пачынаем практычныя крокі», — растлумачыў ён. Вярхоўны лідар Ірана аятала Алі Хаменеі загадаў міністэрству, якое адказвае за атамную энергетыку, падрыхтавацца да павелічэння магутнасцяў па ўзбагачэнні ўрану. Ён заявіў, што краіна не можа адначасова «знаходзіцца пад санкцыямі, адмовіцца ад сваёй ядзернай праграмы і выконваць абмежаванні», накладзеныя пагадненнем з шасцёркай міжнародных пасярэднікаў. Як вядома, у пачатку мая прэзідэнт ЗША Дональд Трамп паведаміў аб выхадзе краіны з пагаднення па іранскай ядзернай праграме — здзелкі, якая накладвала абмежаванні на актыўнасць Тэгерана ў ядзернай сферы ў абмен на зняцце санкцый Савета Бяспекі ААН і абмежавальных мер, якія раней уводзілі ЗША і ЕС.

МЕКСІКА ЎВЯЛА ПОШЛІНЫ НА АМЕРЫКАНСКІЯ ТАВАРЫ

Урад Мексікі абвясціў аб увядзенні мытных пошлін у памеры 15—25 % на стальную прадукцыю і шэраг іншых тавараў з ЗША ў адказ на ўвядзенне адміністрацыяй амерыканскага прэзідэнта Трампа пошлін на сталь і алюміній, што ў ліку іншых краін датычацца Мексікі. Спіс тавараў, якія падпадаюць пад новыя пошліны, апублікаваны ў афіцыйнай газеце мексіканскага ўрада, перадае агенцтва Reuters. У адказ на дзеянні Вашынгтона Мехіка заявіў аб прыняцці аналагічных мер у дачыненні да плоскага стальнога пракату з ЗША, а таксама труб, лямпаў, харчовых тавараў, яблыкаў, вінаграду, розных відаў сыроў у аб'ёме, які кампенсуе страты ад амерыканскіх пошлін.

FACEBOOK ПЕРАДАВАЎ ДАНЫЯ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ 60 ВЫТВОРЦАМ СМАРТФОНАЎ

Кампанія Facebook за апошнія дзесяць гадоў заключыла пагадненні аб перадачы даных карыстальнікаў сацсеткі як мінімум з 60 кампаніямі — вытворцамі мабільных прылад, уключаючы Apple, Amazon, BlackBerry, Microsoft і Samsung. Як піша New York Times, Facebook давала кампаніям-партнёрам доступ да даных карыстальнікаў і іх сяброў без іх згоды нават пасля таго, як заявіла, што больш не будзе перадаваць падобныя звесткі трэцім бакам. Як паведамляе NYT, некаторыя партнёры Facebook мелі доступ да інфармацыі аб сямейным становішчы карыстальніка, яго рэлігійных і палітычных поглядах, а таксама аб мерапрыемствах, якія ён збіраўся наведаць.

51-ГАДОВЫ ФРАНЦУЗ ПЕРАПЛЫВАЕ ЦІХІ АКІЯН

Сваё падарожжа Бенуа Леконт пачаў ад японскага горада Цёсі, размешчанага на акіянскім беразе ў прэфектуры Ціба. Француз паставіў перад сабой задачу стаць першым чалавекам, які пераплыў Ціхі акіян. Ён плануе плыць па восем гадзін у суткі і прыблізна праз паўгода, пераадолеўшы дзевяць тысяч кіламетраў, дабрацца да берагоў ЗША. Небяспекі на шляху Леконта нямала — акулы, штормы, непагадзь і экстрэмальна нізкая тэмпература вады. Плывец хоча сваім заплывам прыцягнуць увагу людзей да праблемы глабальнага пацяплення. Група навукоўцаў, якая рухаецца за Леконтам, будзе праводзіць даследаванні стану акіяна на працягу ўсяго шляху.

Тое, што нас яднае

Паэзія — гэта тое, што нас яднае. Такая думка прагучала падчас сустрэчы з татарскім пісьменнікам Рэнатам ХАРЫСАМ, якая адбылася днямі ў канферэнц-зале «Звязды».

У гутарцы на тэму ўзаемапранікнення дзвюх літаратур прынялі ўдзел беларускія пісьменнікі, прадстаўнікі выдавецтваў і галоўныя рэдактары айчынных выданняў.

— Літаратура — рэха гісторыі народа. Яна адлюстроўваецца ў любым вершы, у любым рамане, — упэўнены паэт і перакладчык Рэнат Харыс. — Калі я рабіў пераклады з беларускай паэзіі, адчуў: у кожным творы — найглыбейшы смутак, гонар і імкненне да захавання сваёй ідэнтычнасці.

Залатаардынскі паэт Саіф Сараі напісаў верш, дзе былі радкі: «Гульдурсун кружылася вакол каханага свайго, як Зямля кружылася вакол Сонца». Гэта адбылося за 70 гадоў да нараджэння Каперніка. А цяпер гісторыю Залатаардынскай дзяржавы ігнаруюць, прадстаўляюць яе як варварскую. Насамрэч усё неадназначна.

У беларускага і татарскага народаў цікавыя лёсы. Паміж беларусамі і татарамі здаўна існавалі сяброўскія сувязі. Разам разграмілі Тэўтонскі ордэн. З тых часоў на беларускіх землях засталося 100 тысяч татар — карані сяброўства вельмі глыбокія. Гэта дае народам права быць бліжэй адзін да аднаго. Акрамя таго, у абодвух вострая стаіць праблема захавання мовы.

Узаемасувязі паміж літаратурамі — гэта ўзаемасувязі паміж душамі народаў. Яны ўзаемаўзбагачаюць. Гэта патрэбна для самазахавання і ўмацавання нашых каранёў.

Яна БУДОВІЧ.

НОВЫ СТАРЫ БРЭНД

Журфак вяртае сваю назву

Такое рашэнне было прынятае падчас круглага стала «Стратэгічнае партнёрства ў сферах медыявытворчасці і масавых камунікацый», які прайшоў у БДУ з удзелам першага намесніка міністра інфармацыі Паўла Лёгкага, рэктара ўніверсітэта Андрэя Караля, кіраўнікоў вядучых беларускіх СМІ, а таксама прафесарска-выкладчыцкага складу факультэта.

Нагадаем, што пасля рэарганізацыі ў БДУ Інстытута журналістыкі ў два самастойныя падраздзяленні пытанне з назвай для факультэта, дзе будуць рыхтаваць кадры для журналістыкі і сферы PR, заставалася адкрытым. Удзельнікі круглага стала калегіяльна прынялі рашэнне аб захаванні вядомай усім назвы, якая даўно стала брэндам, — факультэт журналістыкі.

Надзея НІКАЛАЕВА.

■ Экалогія і мы

У Гальшанцы загінула рыба

Меркаваная прычына — адходы завода

176 асобін загінулай рыбы сабралі работнікі Смаргонскай міжрайінспекцыі на ўчастку ракі Гальшанкі паміж вёскамі Нарушаўцы і Дзертнікі. Як мяркуюць, яна загінула з прычыны таго, што ў раку трапілі адходы крухмальнага завода. Вадкія сцёкі прарвалі абвалоўку карт-назапашвальнікаў і забрудзілі вадацёк. Па патрабаванні інспектараў супрацоўнікі прадпрыемства засыпалі месца прарыву грунтам, аднак водным рэсурсам ужо нанесены сур'ёзны ўрон, паведамілі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Загінулую рыбу таксама знайшлі значна ніжэй па цячэнні — прыкладна за 30 кіламетраў — на тэрыторыі Валожынскага раёна. Тут тая ж рака называецца Альшанка. На трохкіламетровым участку паміж вёскамі Багданава і Дзесятнікі работнікі Маладзечанскай міжрайінспекцыі падабралі 140 асобін загінулай рыбы, у тым ліку чырванакніжнікаў — адну ручаёвую стронгу і тры рачныя міногі.

З пункту гледжання заканадаўства рака Альшанка (Гальшанка) мае высокі ахоўны статус: яна ўключана ў пералік водных аб'ектаў, якія выкарыстоўваюцца для размнажэння, нагулу, зімоўкі і міграцыі ласосепадобных і асетрападобных. Таму тут устаноўлены больш жорсткія патрабаванні да якасці вады, сказалі ў Дзяржінспекцыі.

Ацаніць нанесеную прыродзе шкоду толькі па сабранай рыбе было б неаб'ектыўна, паколькі частка яе сышла на дно, частку знесла цячэннем. У такіх выпадках выкарыстоўваецца іншая методыка: яна ўлічвае плошчу тэрыторыі, што падверглася негатыўнаму ўздзеянню, і прамысловы запас рыбы на канкрэтным участку. У розных пунктах ракі лабараторыі аналітычнага кантролю ўзялі пробы вады. Вынікі аналізаў пакажуць ступень забруджвання і працягласць забруджанага ўчастка.

Месяц таму ў кіраўніцтва Гальшанскага крухмальнага завода ўжо была нагода задумацца: работнікі Смаргонскай міжрайінспекцыі пачалі ў дачыненні да юрыдычнай асобы адміністрацыйны працэс — тады адходы толькі пачалі працякаць скрозь загароду. Цяпер ігнараванне пытанняў экалогіі абернецца для прадпрыемства шматтысячнымі выдаткамі па кампенсацыі нанесенай шкоды.

Сяргей РАСОЛЬКА

■

■ Тры пытанні да ўлады

Стаўка на чыстую ваду і добрыя дарогі

Магілёўскі раён адзін з паспяховых у вобласці. Сёлета спаўняецца пяць гадоў з таго моманту, як раённую ўладу ўзначаліў аўтарытэтны і добрасумленны кіраўнік Анатоль ДУЦЬКО. У яго актыве медаль «За працоўныя заслугі» і ордэн Пашаны. Падчас размовы з ім мы даведаліся, што змянілася ў жыцці раёна апошнім часам і што чакае яго наперадзе.

— Анатоль Іванавіч, калі прыязджаюць высокія госці, што вы ім у першую чаргу паказваеце?

— Нашыя новыя фермы па вытворчасці малака і мяса. Паказваем, як выконваецца даручэнне Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі па навядзенні і падтрыманні парадку ў кожным населеным пункце. У нас 276 населеных пунктаў, і амаль да кожнага за апошнія пяць гадоў мы дайшлі. Сёння ў раёне працуе некалькі адзінак тэхнікі па зносе старых будынкаў і шэсць брыгад па знішчэнні пустазелля. Лес павінен быць там, дзе трэба, а на ворных землях, якія зараслі, робім рэкультывацыю і ўводзім іх у севазварот. Таму, калі нехта пажадае паглядзець, як у нас наводзіцца парадак, мы хоць зараз можам паказаць нашы самыя аддаленыя вёскі — брыгады па навядзенні парадку працуюць і там. Вёска павінна выглядаць культурна — мець добрыя пад'езды, інфраструктуру. І я сачу за тым, каб даручэнні выконваліся. З пяці гадзін раніцы ўжо на колах, усё аб'ехаў, паглядзеў і да васьмі гадзін правяду невялічкую нараду, усім выкажу свае заўвагі.

— Вы вызначаеце палітыку раёна. Што зроблена за пяць гадоў вашага кіраўніцтва такога, чым можаце ганарыцца?

— Як ні было цяжка, мы ўвялі шэсць малочнатаварных комплексаў — гэта адзін з кірункаў нашай вытворчасці, таму што раён сельскагаспадарчы і трэба працаваць па вытворчасці малака. Малако і мяса сёння — гэта жывыя грошы. Перапрацоўшчыкі заўсёды разлічваюцца, даўгоў няма. За пяць гадоў правялі «Дажынкі» ў аддаленых аграгарадках, тых, якія за 50—60 кіламетраў ад Магілёва. Зараз рыхтуем вёску Завадская Слабада. Робім там дарогі, добраўпарадкоўваем тэрыторыю, каб людзі бачылі, што мы пра іх не забыліся. Шмат працуем над захаваннем крыніц. Пабудавалі купелі ў вёсцы Дубінка, аграгарадку Сухары. Зараз у планах зрабіць купель і невялічкую каплічку каля вёскі Хонава. Ёсць крынічка і ў аграгарадку Вендараж. У нас падрыхтаваны план у гэтым кірунку. Зараз дапамагаем будаваць айцу Мікалаю храм на Буйніцкім полі.

Задача № 1 — забяспечыць раён чыстай вадой, пабудаваць сем станцый абезжалезвання і пяць свідравін у Дашкаўцы, Сухарах, Нікіцінічах, Кадзіне, Салтанаўцы, Мастку і Вендаражы. На наступны год мы цалкам закрыем гэтую праграму. А потым возьмемся за дарогі.

— Хто фінансуе гэтыя праекты?

— Абласны бюджэт. Сёлета таксама пачынаем пашыраць дзіцячыя садкі. Ужо ёсць дакументацыя на прыбудову да існуючага садка ў аграгарадку Узыход. З ліпеня пачнём яе будаўніцтва. На чарзе дзіцячы садок у Вейне. Аграгарадок расце, будуюцца дамы, павялічваецца колькасць сем'яў.

Людзі ў нас добрыя, але трохі разбэшчаныя, шмат утрыманскіх падыходаў. На тэрыторыі 172 садаводчыя таварыствы, дзе пражывае амаль 18 тысяч гараджан. Людзі ідуць на прыём да мяне і патрабуюць, каб я «памірыў» іх з суседам, які «залез на чужую мяжу». Прыходзіцца тлумачыць, што гэтым займаецца не старшыня райвыканкама, а суд. Мы павінны самі наводзіць парадак на месцах. Правесці сход са сваімі суседзямі, каб дамовіцца і зрабіць нейкую кантэйнерную пляцоўку або абкасіць тэрыторыю, падфарбаваць масток. Вось прыязджаю ў вёску Гарадок, дзе жывуць адны дачнікі. Зараслі пустазеллем так, што сорамна глядзець. Навялі ім парадак, суседзі з іншых вёсак убачылі і давай тэлефанаваць: а калі прыедзеце да нас? А вось у аддаленых вёсках накшталт Дзядкоў, дзе жывуць людзі больш сталага ўзросту, заўсёды чыста. Зялёны газончык, падкошана — малайцы. Вось як трэба, а не чакаць, што прыйдзе хтосьці і зробіць усё за цябе.

Нэлі ЗІГУЛЯ

■ Тэрыторыя поспеху

СТО ГІСТОРЫЙ, СТО ЛЁСАЎ

Як актыўныя беларусы рэалізуюць сацыяльна значныя ідэі? Пра гэта расказвае фотавыстаўка «Праекты ў асобах».

Чатыры гады таму адбылася прэзентацыя першага сезона выстаўкі. За мінулы час людзі ў 23 гарадах нашай краіны пазнаёміліся з 71 гісторыяй поспеху. Сёлета ж фотамастак Юлія Мацкевіч прадставіла гісторыі яшчэ 29 беларусаў, у якіх былі ідэі і смеласць, каб змяніць да лепшага свет вакол сябе.

Кіраўнік прадстаўніцтва ЕС у Беларусі Андрэа ВІКТАРЫН адзначыла, што яна вельмі рада магчымасці паказаць шырокай грамадскасці людзей, якія пры фінансавай падтрымцы Еўрасаюза паляпшаюць жыццё ў беларускіх гарадах. Спадарыня Віктарын асабліва ўхваліла вучня 9 класа сярэдняй школы № 8 Наваполацка: Данііл Савёнак ініцыяваў установку ліфта ў сваёй школе. Вядома, яму дапамагалі дарослыя, але без настойлівасці і веры ў поспех школьніка нічога б не адбылося. Данііл даў многім вельмі важны ўрок: калі чалавек перасоўваецца ў калясцы, гэта не значыць, што ён чагосьці не можа, проста робіць гэта па-іншаму.

«Тое, што вы бачыце, гэта невялікая частка нашай сумеснай работы з грамадскімі арганізацыямі і органамі мясцовай улады, — адзначыла Андрэа Віктарын. — Наша мэта — агульнымі намаганнямі працаваць на карысць Беларусі, павялічваць дабрабыт людзей. Я спадзяюся, што наша выстава падштурхне іншых людзей стаць больш смелымі ў рэалізацыі сваіх планаў, а мы дапаможам».

Намеснік начальніка ўпраўлення агульнаеўрапейскага супрацоўніцтва МЗС Беларусі Дзмітрый ЕРМАЛЮК выказаў падзяку краінам ЕС за фінансаванне праектаў і назваў гэтую выставу тэрыторыяй поспеху. «Паміж Беларуссю і Еўрасаюзам ёсць шмат значных, цікавых і рэалізаваных праектаў, пра якія не заўсёды ведае шырокая грамадскасць», — сказаў Дзмітрый Ермалюк.

У Мінску выстава будзе працаваць да 10 чэрвеня, а потым пачне свой шлях па 13 гарадах нашай краіны.

Аксана ЯНОЎСКАЯ

Выстаўка працуе па 9 снежня 2018 года

Мінск — *29 мая — 10 чэрвеня*
Валожын — *12 чэрвеня — 24 чэрвеня*
Браслаў — *26 чэрвеня — 8 ліпеня*
Наваполацк — *10 ліпеня — 22 ліпеня*
Мсціслаў — *24 ліпеня — 5 жніўня*
Жыткавічы — *7 жніўня — 19 жніўня*
Бяроза — *21 жніўня — 2 верасня*
Навагрудак — *4 верасня — 16 верасня*
Шчучын — *18 верасня — 30 верасня*
Гродна — *2 кастрычніка — 14 кастрычніка*
Брэст — *16 кастрычніка — 28 кастрычніка*
Гомель — *30 кастрычніка — 11 лістапада*
Магілёў — *13 лістапада — 25 лістапада*
Віцебск — *27 лістапада — 9 снежня*

■ Музей малой радзімы



Прапраўнук Глеб і ўнучка Алена ў вёсцы Нізок.

У ВЁСКУ ДА КРАПІВЫ

«Мінскія адрасы Кандрата Крапівы» — так назваў хлопец сваю навукова-даследчую работу. Ён удакладніў, у які час і дзе пражываў у сталіцы Кандрат Крапіва, з якімі справамі, творчымі пошукамі быў звязаны кожны з гэтых перыядаў жыцця пісьменніка. Навуковым кіраўніком юнага даследчыка стала ўнучка Кандрата Крапівы — кандыдат мастацтвазнаўства Алена Атраховіч.

Днямі яны разам наведалі вёску Нізок Уздзенскага раёна — малую радзіму Кандрата Крапівы. Хата, дзе нарадзіўся будучы класік, зразумела, да нашых дзён не захавалася. Але месца на якім яна стаяла, тут ведае кожны.

Сваю навукова-даследчую работу Глеб перадаў у літаратурны музей Кандрата Крапівы Уздзенскай сярэдняй школы № 2 (там у фондах захоўваецца 250 рэдкіх экспанатаў). Алена Атраховіч падарыла копіі архіўных дакументаў, кнігі Кандрата Крапівы, малюнкі мастака Анатоля Александровіча да зборніка твораў класіка.

Падарункам для музея стала і калекцыя фотаздымкаў, якую даслала газета «Звязда». Фатаграфіі расказваюць, як герояў баек вядомага пісьменніка адлюстроўваюць юныя мастакі, скульптары, майстры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

Яўген ПЯСЕЦКІ. Фота аўтара

Рабочы стол пісьменніка ў экспазіцыі краязнаўчага музея Узды.

Калі пералічваюць вядомых пісьменнікаў, якія нарадзіліся на Уздзеншчыне, — сярод першых называюць Кандрата Крапіву. Сапраўды, кожны з нас лёгка прыгадае хоць бы некалькі п'ес, баек, працытуе радкі.

Здаецца, усё ўжо даўно занатавана і вывучана, што датычыцца біяграфіі класіка. Але яго прапраўнук Глеб Александровіч (вучань мінскай гімназіі № 23) па-свойму прадоўжыў вывучаць спадчыну знакамітага продка.

У раённым музеі захоўваецца рэдкі скульптурны партрэт народнага пісьменніка БССР Кандрата Крапівы, які народны мастак БССР Заір Азгур стварыў з адпаведным для абодвух класікаў добразычлівым гумарам.

На гэтым месцы ў вёсцы Нізок стаяла хата, дзе нарадзіўся Кандрат Крапіва.

У музеі Уздзенскай сярэдняй школы № 2 захоўваюцца тканыя паясы і брыль — рэчы пісьменніка.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

7 ЧЭРВЕНЯ 2018 г.
ЧАЦВЕР
№ 11 (15842)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

Вера ЯРОШЫК:

«МУЗЫКА — ГАЛОЎНАЕ Ў МАІМ ЖЫЦЦІ»

Да нядаўняга часу пра аграгарадок Дзівін Кобрынскага раёна чулі нямногія. Але дзякуючы таленавітай дзесяцікласніцы Веры ЯРОШЫК пра гэта мястэчка даведаліся далёка за межамі Беларусі. Юная спявачка заняла другое месца на тэлевізійным праекце «Ты супер!», які выходзіў на расійскім тэлеканале НТБ. Гэта міжнародны вакальны конкурс для дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў. Пранікнёнымі выступленнямі 16-гадовая Вера скарыла і прафесійнае журы, і гледачоў. Пра музыку ў сваім жыцці, самых блізкіх людзей і планы на будучыню дзяўчына расказала ў інтэрв'ю «Чырвонцы. Чырвонай змене».

— Вера, як трапіла на праект «Ты супер!»?

— Я спрабавала ўдзельнічаць усюды, наколькі гэта было магчыма ў маіх умовах. Пачатак паклаў рэспубліканскі конкурс «Я спяваю» на АНТ, які адбыўся ў 2012 годзе. Потым сталі запрашаць выступаць на канцэрты. Напэўна, таму арганізатары праекта на НТБ мяне і заўважылі. І так атрымалася, што ў снежні мінулага года яго партнёр — радыё Sputnik — выйшаў на мяне і запрасіў на кастынг. А ў студзені паведамілі, што я прайшла адбор.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Клуб «Залатыя рукі»

ЧЫМ КАЗАНЬ БРАЦЬ БУДЗЕМ?

Прафесійным майстэрствам і крэатыўным падыходам

«Гэтая мадэль рукзакоў прызначана для маладых дзяўчат, таму дызайн вітрыны прадстаўлены ў выглядзе вокладкі часопіса моды з трэндамі вясны. Канцэпцыя паўтарае здымкі на Polaroid як адсылку да Instagram, якім карыстаюцца прадстаўніцы мэтавай аўдыторыі. Кубы на фоне сімвалізуюць шматпавярховікі горада. Асноўным колерам абраны трэндавы пяшчотна-ружовы... Кампазіцыя нагадвае пра вясенніе дні, пікнікі і пасядзелкі».

«Вывучыўшы ўсе тэндэнцыі моды, я магу казаць, што на сённяшні дзень рукзакі ўсё больш набіраюць папулярнасць сярод модніц. Раней гэта быў аксесуар спартыўнага стылю без асаблівых індывідуальных рыс. А цяпер ён мае розныя формы, памеры і дызайн. Падыходзіць пад сукенку, шорты, штаны і мноства іншых вобразаў. Паколькі рукі ў сучасных людзей занятыя тэлефонамі і планшэтамі, большасць аддаюць перавагу рукзакам...»

Як вы думаеце, прадстаўнікі якой прафесіі займаюцца сёння афармленнем вітрын? А ці ведаеце вы, якімі навыкамі павінны валодаць, напрыклад, спецыялісты рэстараннага сэрвісу? Ці чаму фларыстыка — не жаночая справа? Рэспубліканскі конкурс WorldSkills Belarus 2018 даў адказы на многія пытанні і стаў сапраўдным гідам у свет сучасных прафесій. За два дні Футбольны манеж і Falcon Club, дзе размясціліся конкурсныя пляцоўкі па 37 кампетэнцыях, наведала некалькі тысяч школьнікаў.

У кампетэнцыі «Кандытарскае мастацтва» ўдзельнікі спаборніцтваў стваралі сапраўдныя салодкія шэдэўры.

ЗАГЛЯДЗЕЦЦА НА ВІТРЫНУ

— Мерчандайзінг вітрын — вельмі цікавая сфера, якая знаходзіцца на стыку мастацтва, дызайну, псіхалогіі, псіхафізікі, эканомікі, маркетынгу і рэкламы, — тлумачыць **галоўны эксперт у кампетэнцыі «Візуальны мерчандайзінг», дырэктар ТАА «Цэнтр паспяховых продажаў» Алена ІВАНОВА.** — Задача візуальнага мерчандайзера — прыпаднесці пакупніку тавар у выгадным святле. Вітрына ў гандлёвым аб'екце — перш за ўсё інструмент маркетынгу: пры дапамозе дызайнерскіх рашэнняў забяспечвае доўгатэрміновую камунікацыю са спажыўцом.

(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)

Свой выбар

НА ВЫШЫНІ І ПАД НАПРУЖАННЕМ

Сяргей ЛЯХ — адзін з тых, хто дапамагае праводзіць электрычнасць у нашы дамы. У літаральным сэнсе. Калі пасля навальніцы альбо моцнага ветру яна знікае, брыгада электраманцёраў выязджае на ліквідацыю непаладак нават пасярод ночы.

Да выбару сваёй прафесійнай будучыні дзевяцікласнік паставіўся сур'ёзна і, можна сказаць, з разлікам. Падбіраў профільныя сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ў Мінску так, каб можна было вучыцца там адначасова са старэйшай сястрой, якая тады паступала ў медыцынскі ўніверсітэт. Сяргея зацікавіла энергетыка, ён быў упэўнены: з такой спецыяльнасцю можна дзе заўгодна ўладкавацца. Так жа асэнсавана хлопец потым шукаў першае працоўнае месца. У выніку трапіў, куды хацеў, — вярнуўся на радзіму, у Лепельскія раённыя электрасеткі. На пытанне, чаму не захацеў застацца ў сталіцы, Сяргей адказвае:

— Вялікі горад мяне не ўразіў. Так, я з задавальненнем прыязджаю да аднагрупнікаў альбо на адпачынак, але жыць там не хацеў бы, не люблю мітусні. Мне нават у кватэры няўтульна, таму будую прыватны дом у прыгараднай вёсцы з умовамі, лічы, гарадскімі. Яшчэ наведваю бацькоў, дапамагаю ім з агародам і гаспадаркай. Да працы з зямлёй прывучаны з маленства, магу трактарчык адрамантаваць, зямлю ўзараць, дровы прывезці і пакалоць — і сабе, і суседзям, — без праблем.

(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
7 06 2018 г.

ЧЫМ КАЗАНЬ БРАЦЬ БУДЗЕМ?

Над стварэннем вясельнага букета шчыруе навучэнец сталічнай гімназіі № 10 Павел Свірскі.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Яна можа быць сапраўдным аб'ектам сучаснага мастацтва, але існуе вельмі шмат іншых інструментаў, якія ўздзейнічаюць на аўдыторыю, таму проста мастацтвам гэты занятак назваць усё ж такі нельга: гэта яшчэ і навука — як заахвоціць да пакупкі? Прафесіянал можа не толькі павысіць продажы, але і палепшыць імідж крамы.

На нацыянальным чэмпіянаце WorldSkills Belarus 2018 кампетэнцыя «Візуальны мерчандайзінг» упершыню трапіла ў конкурсную праграму. Задачай канкурсантаў было за два дні (агулам за 16 гадзін) распрацаваць канцэпцыю і афармiць вітрыну. У якасці галоўнага тавару ўсім канкурсантам былі прапанаваныя восем мадэляў рукзакоў ад «Галантэі», пэўны рэквізіт, плюс кожнаму дасталася «чорная скрыня».

У першы дзень спаборніцтваў маладым прафесіяналам неабходна было прадэманстраваць навыкі правядзення даследавання спажывецкіх характарыстык прадукту, пазіцыянавання яго на рынку, пакупніцкіх пераваг мэтавай аўдыторыі, прасцей кажучы, улавіць яе настрой, а таксама навыкі дызайну для стварэння кампазіцыі вітрыны. Агульная для ўсіх тэма — «Вясна ў горадзе»...

Затым ствараўся эскіз, складалася абгрунтаванне дызайну, падбіраўся рэквізіт і афармлялася вітрына. Абавязковымі былі крэатыўны падыход і аўтарская трактоўка ў выкарыстанні прадметаў з «чорнай скрыні», якія сталі для ўсіх канкурсантаў сюрпрызам. Таксама эксперты ацэньвалі эфектыўнасць створанай камунікацыі з патэнцыяльным спажыўцом.

Важныя якасці для візуальнага мерчандайзера — добры густ, пачуццё стылю, кампазіцыі і колеравага балансу, творчае, крэатыўнае мысленне, веданне модных тэндэнцый, актыўнасць, ініцыятыўнасць, арганізаванасць, уменне працаваць у камандзе, жаданне пастаянна вучыцца новаму.

— Гэта прафесія апрыёры не можа быць масавай, — упэўнена Алена Іванова, — але такія спецыялісты сёння ў дэфіцыце. Працу візуальнага мерчандайзера можна назваць універсальнай: ён запатрабаваны ў самых розных сферах — ад магазінаў будматэрыялаў да элітных буцікоў моднай вопраткі, аксесуараў і абутку. Не сакрэт, што турысты вельмі любяць фатаграфавацца на адпачынку на фоне шыкоўных вітрын. І нашай сталіцы вельмі не хапае такіх, якія былі б тварам горада, дадавалі яму «цікавінку». Таму Гільдыя маркетолагаў, Цэнтр інавацыйнага развіцця і Цэнтр паспяховых продажаў абвясцілі сёлета рэспубліканскі конкурс на найлепшую вітрыну ў краіне.

Цікава, што сярод канкурсантаў у кампетэнцыі «Візуальны мерчандайзінг» на рэспубліканскім чэмпіянаце WorldSkills Belarus 2018 былі як прадстаўнікі ВНУ, так і каледжаў. Перамагла ў ім навучэнка Мінскага прафесійна-тэхнічнага каледжа дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва імя М. Кедышкі Паліна Гурыновіч.

КАЛІ КВЕТКІ — НЕ ПРОСТА ХОБІ

А ў кампетэнцыі «Фларыстыка» сярод канкурсантаў былі нават школьнікі: Павел Свірскі са сталічнай гімназіі № 10, Ганна Азарка з пінскай школы № 2 і Анастасія Стэмплеўская з Правамастоўскай сярэдняй школы. Дарэчы, гэта кампетэнцыя таксама аказалася ў конкурснай праграме дэбютантам.

— Фларыстыку памылкова лічаць жаночай прафесіяй. У сур'ёзных конкурсах і шоу перамагаюць мужчыны. У суседняй Расіі чэмпіёны апошніх гадоў у фларыстыцы таксама мужчыны, — уводзіць у курс справы **эксперт у кампетэнцыі, педагог Мінскай школы фларыстыкі (Minsk Flower School) Раман ФЕДАРОВІЧ.** — Магчыма, у іх большая нацэленасць на вынік і барацьбу, яны больш амбіцыйныя? Шмат дзяўчат, што прыходзяць у нашу сферу, уяўляюць сабе, што яны будуць пырхаць як матылькі вакол кветак, але хутка сыходзяць, бо раптам высвятляецца, што гэта цяжкая фізічная праца: надарваныя ад цяжару спіны, знаходжанне ў парніках ці, наадварот, у пастаянным холадзе, бо кветкі захоўваюцца ў халадзільніку пры тэмпературы плюс пяць градусаў, праблемы з запясцямі і скурай, алергія... Ці кожная вытрымае?

> Аднаго толькі валодання тэхнікай складання букета фларысту мала. Абавязкова трэба мець густ, валодаць ведамі па эстэтыцы, біялогіі, экалогіі, займацца гербарыем. У кожную сваю работу неабходна ўкладваць не толькі прафесійныя навыкі, але і свае сэрца і душу.

На нацыянальным чэмпіянаце ўдзельнікі павінны былі стварыць кампазіцыю са зрэзанымі кветкамі, складсці букет на ўласных сцяблінах, вясельны букет і настольную кампазіцыю з гаршковымі раслінамі. На вясельны букет адводзілася тры гадзіны. На астатнія заданні — па дзве. Згодна з умовамі спаборніцтваў, усім канкурсантам былі прапанаваныя аднолькавыя расліны (эквадорскія ружы, герберы, хрызантэмы, эўкаліпт, аспарагус і іншыя), інструменты, расходныя матэрыялы, спецыяльныя каркасы і прыстасаванні. Толькі вынікі атрымаліся ва ўсіх розныя. На конкурсе можна было пабачыць сапраўдныя аўтарскія работы.

«Шмат дзяўчат, якія прыходзяць у нашу сферу, уяўляюць сабе, што яны будуць пырхаць як матылькі вакол кветак».

Для Беларусі такая сфера, як прафесійная фларыстыка, яшчэ даволі маладая. Па словах Рамана Федаровіча, трапляюць у яе рознымі шляхамі. Часта на курсы ці ў школу фларыстыкі прыходзяць жанчыны, якія знаходзяцца ў дэкрэце, або навучанне асновам прафесіі адбываецца ва ўстановах дадатковай адукацыі паралельна з атрыманнем асноўнай.

— А вось моладзі ў нашай прафесіі не так і шмат, між іншым па ўмовах конкурсу WorldSkills да ўдзелу ў ім дапускаюцца маладыя людзі ва ўзросце да 22 гадоў. Нашых канкурсантаў мы збіралі літаральна па «крупінках»па ўсёй краіне, але тыя, хто сюды трапіў, гэта сапраўдныя алмазы, — усміхаецца эксперт. — Нацыянальны чэмпіянат для нас — гэта яшчэ і магчымасць папулярызаваць фларыстыку сярод моладзі. Мяркую, што на міжнародным узроўні мы можам канкурыраваць і з расіянам, і з прадстаўнікамі Казахстана, а дамінуюць у гэтай сферы зараз прадстаўнікі Паўднёвай Карэі і Кітая. Для іх фларыстыка — гэта філасофія і лад жыцця, і рыхтаваць у гэтай галіне там пачынаюць яшчэ з дзяцінства.

ЁН І САМЕЛЬЕ, І БАРМЕН

Яна БУГЛАК, магістрант Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання, прадстаўляла летась Беларусь на міжнародным конкурсе WorldSkills International у Абу-Дабі ў кампетэнцыі «Рэстаранны сэрвіс». А на нацыянальным чэмпіянаце выступала ў той жа кампетэнцыі ўжо ў ролі галоўнага эксперта. Для недасведчанага чалавека спецыяліст рэстараннага сэрвісу — гэта проста афіцыянт. Але дзяўчына такое меркаванне катэгарычна абвяргае.

— Рэстаранны сэрвіс патрабуе самых шырокіх ведаў у галіне міжнароднай кухні, напіткаў і барнага абслугоўвання, — тлумачыць Яна. — Размова ідзе пра самую важную асобу ў абслугоўванні кліентаў, фактычна адзіную, з кім госць сутыкаецца. На конкурсе ўдзельнікі абавязкова дэманструюць свае ўменні ў модулях Casual Dining (кафэ) і Fine Dining (рэстаран). Апошні мае на ўвазе поўнае абслугоўванне, калі абсалютна ўсё за госця робіць афіцыянт: раскладвае сурвэткі, разлівае напіткі, адсоўвае крэслы... Яму неабходна валодаць не толькі практычнымі навыкамі, але і мець добрыя манеры, быць псіхолагам, упэўненым і вынаходлівым чалавекам. Спецыяліст рэстараннага сэрвісу — універсальны работнік, які павінен умець зрабіць закуску, салату, нарэзку з садавіны ў прысутнасці кліента, прыгатаваць дэсерт з агнём, парцыянаваць гарачыя стравы. Ён ідэнтыфікуе моцныя спіртныя напіткі і віны, фактычна выконвае функцыі самелье, а таксама працуе і за бармена — умее гатаваць безалкагольныя і алкагольныя кактэйлі (усе рэцэптуры павінны быць у яго галаве). Адным з задання на конкурсе было прыгатаванне крэатыўнага кактэйлю з інгрэдыентаў, што знаходзіліся ў «чорнай скрыні». Яшчэ адзін абавязковы навык — уменне варыць каву: амерыкана, экспрэса, латэ і капучына.

Будзем спадзявацца, што нацыянальны чэмпіянат запаліў новыя «зоркі» на прафесійным Алімпе, якія налета годна прадставяць Беларусь на сусветным першынстве WorldSkills International у Казані.

Ведай нашых!

Студэнткі БДУ «разрулілі» спрэчку на Марсе

Каманда факультэта міжнародных адносін БДУ ў складзе трэцякурсніцы Алены Лаўрэнавай і магістранткі Дар'і Богдан прадставіць Еўропу ў фінале Міжнароднага конкурсу па касмічным праве імя Манфрэда Лахса. Гэту магчымасць дзяўчаты заваявалі ў еўрапейскім раўндзе, які завяршыўся ў Лісабоне (Партугалія).

Конкурс з'яўляецца адным з самых прэстыжных студэнцкіх спаборніцтваў па міжнародным касмічным праве ў свеце. Адборачныя раўнды праводзяцца практычна ва ўсіх частках свету — Еўропе, Амерыцы, Афрыцы, Азіі і Ціхаакіянскім рэгіёне.

Касмічнае права рэгулюе дзейнасць дзяржаў і прыватных асоб па даследаванні і выкарыстанні касмічнай прасторы, Месяца і іншых нябесных цел, якія з'яўляюцца агульным набыткам усяго чалавецтва.

Канкурсантам трэба было падрыхтаваць на англійскай мове пісьмовую і вусную пазіцыю па выдуманай справе ў рамках працэдуры Міжнароднага суда ААН. **На гэты раз давялося вырашаць «спрэчку», якая ўзнікла ў 2056 годзе паміж дзвюма дзяржавамі — Неапіліяй і Кальвіёнам.** Ва ўмовах перанасялення Зямлі і поўнага знясілення зямных рэсурсаў краіны робяць спробы асваення Марса. Неапілія рэалізуе праграму па змяненні клімату Марса для далейшага перасялення туды людзей. Кальвіён здабывае мінеральныя рэсурсы на гэтай планеце. У пэўны момант адначасовая дзейнасць дзвюх краін на Марсе становіцца немагчымай, і яны звяртаюцца ў Міжнародны суд ААН для ўрэгулявання спрэчкі. У справе закрануты пытанні правамернасці кібератак, выкарыстання касмічных рэсурсаў, змянення клімату і адказнасці за шкоду, нанесеную касмічнымі аб'ектамі.

Каманда факультэта міжнародных адносін БДУ брала ўдзел у конкурсе ўпершыню і здолела перамагчы ў еўрапейскім туры 20 зборных, сярод якіх былі каманды з Каралеўскага каледжа Лондана (Вялікабрытанія), Ляйдзенскага ўніверсітэта (Нідэрланды), Універсітэта Бруселя (Бельгія), Універсітэта Генуі (Італія), Універсітэта Ла Сапьенца (Італія), Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў (Расія) і іншыя.

Сусветны фінал пройдзе ў Брэмене (Германія) з 2 па 4 кастрычніка ў рамках Міжнароднага кангрэса астранаўтыкі. Сапернікамі беларусак стануць тры каманды — з Індыі, ЗША і Афрыкі.

Па сутнасці пытання

ПРАЎДА І МІФЫ БРЭНДЫНГУ

Студэнты філалагічнага факультэта БДУ выпусцілі навучальны фільм на англійскай мове «Myths around us» («Міфы вакол нас»). Яго аўтарамі сталі першакурснікі і пяцікурснікі спецыяльнасці «класічная філалогія».

Фільм у гульнявой форме дэманструе, якія памылкі робяць вытворцы пры выбары назваў гандлёвых марак, калі звяртаюцца да класічных міфаў. У сваім відэа студэнты пераканаўча даказваюць, што сучасныя метады прасоўвання тавараў і паслуг павінны быць заснаваныя на глыбокім разуменні міфалогіі старажытных Грэцыі і Рыма. Часцей за ўсё няведанне змястоўнай трактоўкі антычных вобразаў прыводзіць да кур'ёзных памылак. Напрыклад, у сюжэце студэнты дэталёва прааналізавалі назвы беларускіх фірмаў, дзе сустракаюцца вобразы Адысея, менад і дрыяд. Дрыяды, паводле старажытнагрэчаскай міфалогіі, з'яўляюцца заступніцамі дрэў. Аднак некаторыя беларускія мэблевыя фірмы неабдумана выкарыстоўваюць у сваіх лагатыпах імёны дрэвавых німфаў, што супярэчыць прызначэнню захавальніц лесу. Дарэчы, дрыяды за беспадстаўнае пашкоджанне або знішчэнне дрэў маглі сурова пакараць чалавека.

Прэм'ера фільма адбылася з прыцягненнем удзельнікаў навуковага форуму, які праходзіў у Варшаўскім універсітэце, і студэнтаў філфака. Абмеркаванне прайшло ў фармаце анлайн.

Матэрыялы падрыхтавала Надзея НІКАЛАЕВА.

Пазнаёміцца з прафесіяй

ДНЁМ СТУДЭНТ, А ЎВЕЧАРЫ — НЯНЬКА, ці Як стаць бэбісітарам

Кім можа ўладкавацца студэнт на падпрацоўку? Касірам у рэстаран хуткага харчавання, разносчыкам рэкламных лістовак, аператарам у кол-цэнтр... ці нянькай. Для гэтага трэба размясціць анкету на інтэрнэт-пляцоўцы babysitter.by, і бацькі, якім патрэбна дапамога, самі вас знойдуць. Мы пагутарылі са студэнткамі, якія прыглядаюць за чужымі дзецьмі, даведаліся, як яны бавяць час з малечай і колькі каштуе гэтая праца.

ЗАРАБІЦЬ НА ПАДАРОЖЖА

20-гадовая **Ганна АСТРОЎСКАЯ** вучыцца на факультэце міжнародных адносін БДУ. Яшчэ першакурсніцай яна захацела папрацаваць у летнім лагеры. Тым больш вопыт догляду за дзецьмі быў: дзяўчына дапамагала выхоўваць малодшую сястру з пялюшак. Ганна прайшла Школу важатага і паехала на змену ў Анапу. Спадабалася. Пасля гэтага і задумалася пра тое, каб паспрабаваць сябе ў ролі нянькі.

Узрост немаўлят, з якімі даводзілася працаваць студэнтцы, — ад чатырох месяцаў да чатырох гадоў. Прызнаецца, што з самымі маленькімі спачатку было страшна заставацца. Але дзяўчына добра падрыхтавалася. Глядзела відэа на YouTube, звярталася па парады да стрыечнай сястры, якая нарадзіла.

Перш чым прыйсці ў сям'ю, Ганна даведваецца пра пол, інтарэсы дзіцяці і рыхтуецца да сустрэчы.

— У мяне заўсёды ёсць «багаж» розных гульняў. І рухавых (напрыклад, будуем паласу перашкод з падушак), і з цацкамі. Раздрукоўваю развівальныя размалёўкі з персанажамі, якія падабаюцца дзецям. Неяк бацькі чатырохгадовай дзяўчынкі прасілі мяне дадаць у гульню англійскую мову: я прыдумала, што мы ляцім з лялькай у Амерыку, і развучыла пару слоў, — расказвае студэнтка.

Як наладзіць кантакт з дзіцем, якога бачыш упершыню? Дзяўчына дзеліцца лайфхакам: падарыце яму што-небудзь.

Увогуле няньцы трэба быць гатовай да ўсяго. «Каб дзіця не хвалявалася, што мама сышла, самае галоўнае — адцягнуць яго ўвагу і адразу нечым заняць. Я заўсёды прадумваю цалкам увесь дзень і расказваю пра свой план бацькам».

Ганна вучыцца на сур'ёзнай спецыяльнасці, таму стараецца не прапускаць заняткі. Максімум, колькі заказаў брала на тыдзень, — тры-чатыры.

— Я неяк працавала прадаўцом у краме — гэта цяжка. А ад работы бэбісітарам не стамляюся, яна мне падабаецца, — усміхаецца дзяўчына.

Цяпер на сайце зарэгістравана каля 200 бацькоў, 70 з якіх карыстаюцца ім рэгулярна. Пакуль праект працуе толькі ў Мінску, але яго плануюць запусціць ва ўсіх абласных цэнтрах.

АТРЫМАЦЬ ВОПЫТ

— Мне заўсёды падабалася праводзіць час з маленькімі дзецьмі. Іх узаемны інтарэс таксама адчуваю. Немаўля пастаянна ўсміхаецца, і настолькі шчырае і цікаўнае, што немагчыма заставацца раўнадушным. Падчас візітаў я і сама адкрываю нешта новае для сябе, — расказвае, чаму вырашыла падпрацоўваць нянькай, чацвёртакурсніца Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта **Марыя ЦЫБУКОВА.**

Прызнаецца: перад першым заказам было крыху страшна. «Нам казалі, што, калі бацькам нешта не спадабаецца, яны маюць права адмовіцца ад паслуг. Мне трэба было прыглядзець за двума дзецьмі — 6 і 12 гадоў. Мы гулялі ў «настолкі», малявалі і гутарылі. Час прайшоў вельмі хутка, і ў выніку ўсе засталіся задаволеныя. Цяпер хаджу працаваць з радасцю і энтузіязмам».

Марыі даводзілася прыглядаць за хлопчыкамі і дзяўчынкамі рознага ўзросту, але часцей гэта была малеча ад двух да трох гадоў. Звычайна няньку запрашаюць на дзве-чатыры гадзіны. Бацькі ў гэты час ходзяць у кіно, на канцэрты ці проста працуюць дома ў суседнім пакоі. А Марыя гуляе з дзецьмі, малюе, майструе, чытае ім казкі. Пра рэжым (напрыклад, у колькі і чым пакарміць, калі пакласці спаць) мамы заўсёды папярэджваюць.

— Як правіла, усё праходзіць добра. Вядома, у кожнага малога свой характар і звычкі. Але, калі ўзнікаюць пытанні, якія я сама не магу вырашыць, тэлефаную бацькам, і яны падказваюць, што рабіць у пэўнай сітуацыі, — дзеліцца студэнтка.

Заробленых грошай дзяўчыне хапае на тое, каб набыць што-небудзь з адзення ці пабалаваць сябе нечым смачненькім.

Чацвёртакурсніца адзначае: работа бэбісітарам — гэта бясцэнны вопыт, які ёй, як будучай маме, безумоўна, спатрэбіцца.

ДАЗВОЛ АД ПСІХОЛАГА

Пляцоўка babysitter.by працуе з мінулага кастрычніка. **Кіраўнік праекта Эльвіра ГРАХОЎСКАЯ** расказвае, што ўсіх, хто хоча быць нянькай, яны правяраюць. Саіскальнікі рэгіструюцца праз сацыяльныя сеткі, і адміністратары сайта праглядаюць старонкі студэнтаў. Потым запрашаюць у Школу бэбісітараў. Заняткі доўжацца адзін дзень. Маладыя людзі запаўняюць анкету, праходзяць індывідуальную гутарку з псіхолагам і тэсціраванне. Далей навучанне: расказваюць, як папярэдзіць істэрыку, як прыдумаць новыя гульні з цацкамі, якія ёсць у малечы, якія асаблівасці развіцця характэрныя для кожнага ўзросту.

— У нас было пару бэбісітараў, якім мы адмовілі, — успамінае Эльвіра Грахоўская. — У адной дзяўчыны скасоўвалі шлюб бацькі, у другой не ладзіліся адносіны з маладым чалавекам, і таму яны абедзве перажывалі стрэс. А ў такім нервозным стане непажадана кантактаваць з дзецьмі. Мы прапанавалі дзяўчатам вярнуцца пазней, калі іх асабістыя праблемы вырашацца.

Як наладзіць кантакт з дзіцем, якога бачыш упершыню? Дзяўчына дзеліцца лайфхакам: падарыце яму што-небудзь.

Ахвотным быць нянькамі трэба прад'явіць дакументы: пашпарт і студэнцкі білет. Калі кандыдату яшчэ няма 18 гадоў, неабходны таксама пісьмовы дазвол ад бацькоў на работу.

Адміністратары праекта дапамагаюць бэбісітарам скласці маршрут, адказваюць на пытанні, якія ўзнікаюць пасля візітаў да дзяцей. Калі студэнт позна затрымліваецца на заказе, тэлефануюць, каб даведацца, ці ўсё ў яго добра.

Паслугі нянек, трэба сказаць, запатрабаваныя. Цяпер на сайце зарэгістравана каля 200 бацькоў, 70 з якіх карыстаюцца ім рэгулярна. Пакуль праект працуе толькі ў Мінску, але яго плануюць запусціць ва ўсіх абласных цэнтрах.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

НА ВЫШЫНІ І ПАД НАПРУЖАННЕМ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Падчас вучобы ў Мінскім дзяржаўным энергетычным каледжы будучым спецыялістам расказвалі пра работу станцый і падстанцый, а вось патрэніравацца з рыштункам амаль не даводзілася. Давучваўся Сяргей ужо ў калег па брыгадзе. Сапраўдным электраманцёрам навічок можа назваць сябе толькі праз некалькі месяцаў пасля пачатку работы, калі вытрымлівае экзамен. Да гэтага моманту ён вучыцца ў настаўніка — вопытнага ў прафесіі чалавека. Сяргей жартам называе «Правілы тэхнікі бяспекі пры эксплуатацыі электраўстановак» сваёй настольнай кнігай, менавіта па ёй хлопец рыхтаваўся да іспытаў перад камісіяй ад прадпрыемства.

Выдатнае веданне тэхнікі бяспекі — абавязковае, бо прафесія адносіцца да небяспечных. Ёсць шмат абставін, калі электраманцёр не можа працаваць, у першую чаргу, яны звязаны з неспрыяльным надвор'ем. Хоць, калі адбыўся абрыў на лініі і вёска або ферма засталіся без электрычнасці, даводзіцца шукаць кампраміс, бо пакідаць людзей «без святла» таксама нельга.

...Перад тым, як падымацца на апору, Сяргей апранае спецвопратку. Прапануе здагадацца, колькі каштуе такая амуніцыя? Зразумела, пытанне з падвохам: на недасведчаны погляд тканіна нічым асабліва не вылучаецца, хіба што даволі шчыльная.

Як аказалася, кошт касцюма ад тэрмічных рызык, спецыяльных чаравікаў, нацельнай бялізны, пояса, каскі, лазаў («кошак») па бетоне можа даходзіць да тысячы долараў.

Безумоўна, спецвопратка выконвае ахоўныя функцыі, але часам прымушае папацець. У гэтым Сяргей упэўніўся на рэспубліканскіх спаборніцтвах па прафесійным майстэрстве.

— Памятаю, была сапраўдная летняя спёка градусаў пад трыццаць, а мы выконвалі заданні на хуткасць і ў поўнай амуніцыі: форма, бялізна, кофта да горла, падшлемнік... Дык вось, калі потым вешаў адзенне на крэсла, то да вечара пад ім збіралася сапраўдная лужына.

На рэспубліканскіх спаборніцтвах у 2014 годзе брыгада з Лепеля выступала ад Полацкіх электрасетак. Упершыню прабіўшыся ў фінал, хлопцы занялі трэцяе месца. Летась лепельскія электраманцёры таксама выйшлі на «рэспубліку» і гэтым разам саступілі толькі калегам з Гродна.

Калі на спаборніцтвах Сяргей выкладваецца поўнасцю, то ў звычайным жыцці лічыць сябе чалавекам неэкстрэмальным.

— Пакуль вучыўся, разам з сябрамі дзеля цікаўнасці скокнуў з парашутам. Уражанні пасля свабоднага падзення невытлумачальныя, але паўтарыць пакуль не цягне. Кола паміж працай і домам разбіваю вандроўкамі. Летась разам з сям'ёй наведалі Чэхію, пабывалі ў старажытнай і прыгожай Празе. Хацелася б яшчэ трапіць у Германію, ці — чым чорт не жартуе — у Амерыку.

Са сваёй жонкай Сяргей пазнаёміўся, калі дзяўчына прыехала на лета ў вёску з Растова-на-Доне. Сяргей жартуе, што характарамі яны не сышліся, але гэта не перашкодзіла згуляць вяселле. Калі ў пары нарадзіўся хлопчык, кожны з бацькоў меў свой варыянт імя. Спрэчкі вырашыла цешча, якая параіла назваць хлопца Платонам.

— Я задаволены тым, як усё склалася, — падводзіць вынік гутаркі Сяргей. — У мяне звычайная сярэдняя спецыяльная адукацыя, але на курсах павышэння кваліфікацыі атрымаў сумежныя спецыяльнасці стропальшчыка і работніка люлькі. Пяць гадоў працоўнага вопыту дазваляюць стаць майстрам брыгады. Ведаю, што некаторыя імкнуцца атрымаць вышэйшую адукацыю проста дзеля дыплома, але вучоба ва ўніверсітэце не гарантуе выпускнікам ні добрага працаўладкавання, ні высокіх заробкаў.

Проста існуе такі тып людзей, якім прасцей рабіць нешта сваімі рукамі, прычым рабіць гэта выдатна. Хоць калі ты плануеш рухацца далей у прафесіі і дасягаць нейкага новага ўзроўню, тады, насамрэч, патрабуюцца дадатковыя веды.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.

Мінск — Лепель — Мінск.

УО «Белорусская государственная
АКАДЕМИЯ СВЯЗИ»

ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР на первую ступень послевузовского образования (аспирантура) на 2018 год по специальностям:

05.11.13 – приборы и методы контроля природной среды, веществ, материалов и изделий (2 места за счет средств республиканского бюджета, дневная форма обучения);

05.12.13 – системы, сети и устройства телекоммуникаций (2 места за счет средств республиканского бюджета, дневная форма обучения).

Сверх плана приема в аспирантуру набор на все специальности проводится на платной основе.

Прием документов осуществляется с 1 августа по 30 сентября по адресу: г. Минск, ул. Фр. Скорины, 8/2, т. 267-86-01, nto@bsac.by.

Подробная информация на сайте: **bsac.by.**

УНП 100211963

УЧРЕЖДЕНИЕ ОБРАЗОВАНИЯ «БЕЛОРУССКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ УНИВЕРСИТЕТ ФИЗИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ»

объявляет прием в аспирантуру и докторантуру на 2018 год по следующим отраслям наук и соответствующим специальностям за счет средств республиканского бюджета и на платной основе

АСПИРАНТУРА*

Специальность	Форма получения образования		
	дневная	заочная	соискательство
03.00.00 – Биологические науки			
03.03.01 – физиология	—	—	—
13.00.00 – Педагогические науки			
13.00.04 – теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры	5	11	8

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение образовательной программы аспирантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — 3 года, в заочной форме получения образования — 4 года, в форме соискательства — до 5 лет. Поступающие в аспирантуру на дневную и заочную форму получения образования должны сдать кандидатские экзамены и зачеты по общеобразовательным дисциплинам до поступления.

ДОКТОРАНТУРА*

Специальность	Форма получения образования	
	дневная	соискательство
13.00.00 – Педагогические науки		
13.00.04 – теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры	3	3

**Указано количество мест для получения образования за счет средств республиканского бюджета.*

Освоение образовательной программы докторантуры осуществляется: в дневной форме получения образования — 3 года, в форме соискательства — до 5 лет.

Прием лиц для получения послевузовского образования осуществляется в порядке, определенном Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь (Указ Президента Республики Беларусь от 01.12. 2011 № 561).

Подготовка научных работников высшей квалификации осуществляется на договорной основе.

Зачисление в аспирантуру и докторантуру БГУФК — 1 ноября 2018 года.

По вопросам поступления в аспирантуру и докторантуру БГУФК обращаться: 220020, г. Минск, пр. Победителей, 105, кабинет 234. Тел. +375 17 369 63 62.
E-mail: aspirantura@sportedu.by.
Прием документов в аспирантуру и докторантуру **с 1 августа по 30 сентября 2018 года.**

УНП 100007545

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў»

АБ'ЯЎЛЯЕ НАБОР НА 2018 ГОД У АСПІРАНТУРУ

ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму для атрымання паслявузаўскай адукацыі за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту па наступных спецыяльнасцях:

АСПІРАНТУРА

Шыфр і назва спецыяльнасці	Форма атрымання адукацыі	Колькасць бюджэтных месцаў
17.00.01 – тэатральнае мастацтва	дзённая	1
17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура	дзённая	2
	саіскальніцтва	1
17.00.06 – тэхнічная эстэтыка і дызайн	дзённая	2

Адначасова ажыццяўляецца прыём у аспірантуру і дактарантуру за кошт юрыдычных і фізічных асоб на платнай аснове.

Дакументы для паступлення прымаюцца з 1 жніўня па 30 верасня 2018 года па адрасе: 220012, г. Мінск, вул. Сурганава, 14а, кабінет 508.

Падрабязная інфармацыя – на сайце ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў» **(http://bdam.by/graduate_school/)** і па тэлефонах: **+375 17 331 70 08, +375 44 579 73 38.**

УНП 100289132

УНП 100302394

Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет имени Максима Танка»

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ

В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ В 2018 ГОДУ ЗА СЧЕТ СРЕДСТВ РЕСПУБЛИКАНСКОГО БЮДЖЕТА

Специальность	АСПИРАНТУРА			ДОКТОРАНТУРА	
	Дневная	Заочная	Соиска-тельство	Дневная	Соиска-тельство
01.01.09 – дискретная математика и математическая кибернетика	1	0	0	0	0
01.04.07 – физика конденсированного состояния	1	0	0	0	0
07.00.02 – отечественная история	1	0	3	0	1
07.00.03 – всеобщая история (соответствующего периода)	2	0	0	0	0
10.01.01 – белорусская литература	1	0	0	0	1
10.01.02 – русская литература	1	0	0	0	0
10.02.01 – белорусский язык	1	0	1	0	1
10.02.02 – русский язык	0	0	1	0	0
10.02.20 – сравнительно-историческое, типологическое и сопоставительное языкознание	2	0	1	0	0
13.00.01 – общая педагогика, история педагогики и образования	0	0	0	0	1
13.00.02 – теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)	1	1	1	0	0
13.00.08 – теория и методика профессионального образования	0	0	0	0	2
19.00.01 – общая психология, психология личности, история психологии	2	0	0	0	0
19.00.05 – социальная психология	2	1	1	0	0
19.00.07 – педагогическая психология	1	0	0	0	0
19.00.10 – коррекционная психология	0	0	1	0	0
19.00.13 – психология развития, акмеология	0	1	0	0	1
Итого	**16**	**3**	**9**	**0**	**7**

Обучение в аспирантуре и докторантуре за счет средств республиканского бюджета осуществляется на договорной основе.

Лица, получившие послевузовское образование за счет средств республиканского бюджета независимо от формы получения такого образования, не имеют права на получение второго послевузовского образования той же ступени за счет средств республиканского бюджета.

Прием лиц для получения послевузовского образования на платной основе осуществляется по всем специальностям, по которым ведется подготовка в аспирантуре и докторантуре БГПУ.

Документы принимаются с 1 августа по 28 сентября 2018 года.

С перечнем необходимых документов, требованиями к поступающим, условиями допуска к вступительным экзаменам и зачисления в аспирантуру и докторантуру можно ознакомиться на сайте БГПУ http://www.bspu.by/Аспиранту/Вступительная кампания.

Наш адрес: 220030, г. Минск, ул. Советская, 18, аспирантура и докторантура (каб. 96, 97, корпус 1). Телефоны для справок: 8 (017) 226-46-64, 8 (017) 327-82-04.

УНП 100286677

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ У АСПІРАНТУРУ І ДАКТАРАНТУРУ на 2018 год па наступных спецыяльнасцях:

Спецыяльнасць	Аспірантура*			Дактарантура*	
	Дзённая форма навучання	Завочная форма навучання	Саіскальніцтва	Дзённая	Саіскальніцтва
Педагагічныя навукі					
05.25.03 – Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства	1	–	2	–	
13.00.05 – Тэорыя, методыка і арганізацыя сацыяльна-культурнай дзейнасці	3	–	1	–	
Мастацтвазнаўства					
17.00.09 – Тэорыя і гісторыя мастацтваў	3	–	9	1	–
Культуралогія					
24.00.01 – Тэорыя і гісторыя культуры	4	–	2	1	1
24.00.03 – Музеязнаўства, кансервацыя і рэстаўрацыя гісторыка-культурных аб'ектаў	–	1	–	–	

**вызначана колькасць месцаў для навучання за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.*

Прыём асоб для атрымання паслявузаўскай адукацыі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Палажэннем аб падрыхтоўцы навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі ў Рэспубліцы Беларусь (Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 561 ад 01.12.2011).

ПРЫЁМ ДАКУМЕНТАЎ У АСПІРАНТУРУ З 1 ЖНІЎНЯ ПА 30 ВЕРАСНЯ 2018 ГОДА

Па пытаннях паступлення ў аспірантуру звяртацца: 220007, г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17, пакой 225. Тэл. (+375 17) 222 83 79

УО «Частный институт управления и предпринимательства»

С 1 АВГУСТА ПО 30 СЕНТЯБРЯ 2018 Г. ОБЪЯВЛЯЕТ НАБОР В АСПИРАНТУРУ ПО СПЕЦИАЛЬНОСТИ

08.00.05 – «Экономика и управление народным хозяйством».

ОБУЧЕНИЕ ПЛАТНОЕ.

Дополнительная информация: тел.: 369 79 99, +375 44 562 72 10. Сайт: www.imb.by.

УНП 101244817

Учреждение образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы»

УНП 500037559

ОБЪЯВЛЯЕТ ПРИЕМ В АСПИРАНТУРУ И ДОКТОРАНТУРУ В 2018 ГОДУ

Прием в аспирантуру университета осуществляется за счет средств республиканского бюджета (количество мест указано в таблице) и на платной основе по следующим специальностям:

№ п/п	Научные направления / Специальности	Форма получения образования					
		Дневная		Заочная		Соискательство	
	Физико-математические науки	бюджет	в том числе целевое место	бюджет	в том числе целевое место	бюджет	в том числе целевое место
1	Вещественный, комплексный и функциональный анализ	1					
2	Дифференциальные уравнения, динамические системы и оптимальное управление						
3	Радиофизика						
4	Оптика						
5	Физика конденсированного состояния						
6	Лазерная физика						
7	Системный анализ, управление и обработка информации (промышленность)	1					
8	Математическое моделирование, численные методы и комплексы программ						
	Биологические науки						
9	Биохимия						
10	Биотехнология (в т. ч. бионанотехнологии)						
11	Микробиология						
12	Физиология						
	Технические науки						
13	Динамика, прочность машин, приборов и аппаратуры						
14	Физика конденсированного состояния						
15	Материаловедение (машиностроение)			1	1		
16	Технология и переработка полимеров и композитов						
	Исторические науки						
17	Отечественная история	1	1				
18	Историография, источниковедение и методы исторического исследования	2	1				
19	Теория и история культуры						
	Экономические науки						
20	Экономика и управление народным хозяйством (экономика и управление предприятиями, отраслями, комплексами)						
21	Математические и инструментальные методы экономики					1	
	Философские науки						
22	Социальная философия						
23	Теория и история культуры						
	Филологические науки						
24	Белорусский язык						
25	Русский язык	3	1				
26	Литература народов стран зарубежья (польская литература)						
27	Теория литературы. Текстология	1	1				
28	Славянские языки						
29	Теория языка					1	1
30	Сравнительно-историческое, типологическое и сопоставительное языкознание			1			
	Юридические науки						
31	Теория и история права и государства; история учений о праве и государстве					1	1
32	Гражданское право; предпринимательское право; семейное право; международное частное право			1			
33	Земельное право; природоресурсное право; экологическое право; аграрное право						
34	Уголовное право и криминология; уголовно-исполнительное право						
35	Уголовный процесс						
36	Криминалистика; судебно-экспертная деятельность; оперативно-розыскная деятельность						
	Педагогические науки						
37	Общая педагогика, история педагогики и образования	4	1	1	1	1	1
38	Теория и методика обучения и воспитания (литература)						
39	Теория и методика обучения и воспитания (физика)						
40	Теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры	1					
	Психологические науки						
41	Педагогическая психология						
42	Психология развития, акмеология					1	
	Культурология						
43	Теория и история культуры	3	2				

По указанным специальностям осуществляется прием в аспирантуру ГрГУ им. Я. Купалы на платной основе в дневной и заочной форме получения образования, а также для обучения в форме соискательства. Количество мест для получения послевузовского образования на платной основе ограничивается возможностью обеспечения лиц, поступающих в аспирантуру, научными руководителями.

Прием в **докторантуру** университета осуществляется по специальности «Оптика» за счет средств республиканского бюджета (1-е место на дневной форме обучения) и на платной основе.

Прием документов в аспирантуру и докторантуру учреждения образования «Гродненский государственный университет имени Янки Купалы» в 2018 году будет осуществляться с 1 августа по 28 сентября 2018 года в соответствии с Положением о подготовке научных работников высшей квалификации в Республике Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 01.12.2012 № 561, иными актами законодательства Республики Беларусь.

По вопросам поступления обращаться по адресу: г. Гродно, ул. Ожешко, 22, ауд. 401, тел. 8 0152 73 19 27, e-mail: www.postgraduate@grsu.by.

«ПЛАНЕТА» МАЛАДЗЁЖНЫХ ІНІЦЫЯТЫЎ

Сёння «Чырвонка. Чырвоная змена» друкуе апошнія «пробы пяра» нашых юных і маладых няштатных аўтараў, якія паступілі на чарговы конкурс «Я — малады. І мне не ўсё роўна!» і былі адабраны для публікацыі як найлепшыя. У найбліжэйшым выпуску дадатку плануецца падвесці вынікі творчага спаборніцтва і назваць імя (ці імёны) яго пераможцы (пераможцаў). Тады ж мы традыцыйна правядзём і невялікі «разбор палётаў».

А пакуль у якасці агульнага каментарыя (апроч, вядома, шчырых віншаванняў удзельнікам, чыя «пробы пяра» з'явіліся на старонках «Чырвонкі. Чырвонай змены») хацелася б сказаць наступнае. Конкурс чарговы раз засведчыў, што інтарэс да журналісцкай прафесіі з боку творчай беларускамоўнай моладзі не знікае. Гэта, канешне ж, не можа не радаваць, будучыя калегі! Менавіта так, паколькі мы спадзяёмся, што ўсе вы, хто марыць аб прафесіі, паступіце на журфак, адвучыцеся і прыйдзеце да нас працаваць. Уласна, конкурс для гэтага і задумваўся: дапамагчы таленавітым і настойлівым знайсці свой шлях у жыцці. Да нашых абавязковых наступных сустрэч!

Мець актыўную жыццёвую пазіцыю, быць творчымі, ініцыятыўнымі, самастойнымі... Развіваць гэтыя важныя якасці дапамагаюць заняткі ў клубе ЮНЕСКА «Планета» Маладзечанскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі «Маладзік».

Гісторыя аб'яднання бярэ пачатак у далёкіх 1970-х з клуба інтэрнацыянальнай дружбы.

— Гэта быў той час, калі сродкам камунікацыі з'яўлялася пісьмо, і невялікі сціплы канверцік мог абляцець увесь свет, робячы сябрамі незнаёмых людзей. Пра жыццё сваіх аднагодкаў дзеці даведваліся тады менавіта з папяровых вестачак, — успамінае **кіраўнік клуба «Планета» Валянціна САЕНКА.** — З таго часу застаўся наш дэвіз: «Няхай будуць сяброўствам сагрэтыя ўсе пяць частак вялікай планеты!»

Цесная сувязь з аднагодкамі далёкага і блізкага замежжа падтрымліваецца і цяпер. Вось ужо некалькі гадоў члены маладзечанскага клуба прымаюць удзел у міжнародным валанцёрскім лагеры «Зямля — наш агульны дом».

Клуб займаецца прапагандай ідэалаў ААН і ЮНЕСКА, здаровага ладу жыцця. Падлеткі вывучаюць правы дзіцяці і чалавека, знаёмяцца з гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі. Усе мерапрыемствы праходзяць інтэрактыўна: гутаркі, дыскусіі, абмеркаванне сітуацый, ролевыя, дзелавыя і камунікатыўныя гульні. І ў аснове ўсёй работы ляжыць валанцёрская дзейнасць. Напрыклад, юнакі і дзяўчаты праводзяць практыкаванні «Лячэбная магія» для дзяцей з абмежаванымі магчымасцямі. Гульні з паперкамі, ніткамі, гумкамі не толькі развіваюць маторыку рук, кемлівасць, але і прыводзяць дзяцей у захапленне, зараджаюць станоўчымі эмоцыямі.

Удзельнікі і аўтары праекта «Палярная зорка».

Клуб ЮНЕСКА — своеасаблівая школа лідара. Кожны з яе членаў праводзіць семінары, трэнінгавыя заняткі па прынцыпе «Роўны навучае роўнага». Такі падыход дае станоўчы вынік, бо інфармацыя з вуснаў аднагодка падаецца больш даступна і цікава, на звыклай і зразумелай мове.

У клубе ёсць магчымасць ствараць і ўвасабляць свае праекты. Напрыклад, у рамках Дзяржаўнай праграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» распрацаваны праект «Выбіраем здароўе». У 2015 годзе праект клуба «Прававы эрудыт» атрымаў рэспубліканскі грант для яго рэалізацыі.

На веснавых канікулах прайшоў асноўны этап прафарыентацыйнага праекта «Палярная зорка», яго аўтары — Марыя Прыткова і Уладзіслаў Бажко. Ён разлічаны на школьнікаў, якія маюць цяжкасці з выбарам прафесіі, баяцца зрабіць памылку, паступіўшы не ў тую навучальную ўстанову.

— Як зорка дапамагае арыентавацца ноччу, так і гэтая ініцыятыва дае магчымасць адчуць усе складанасці абранай спецыяльнасці, акунае з галавой у тую сферу дзейнасці, з якой падлеткі збіраюцца звязаць сваю будучыню, — тлумачыць Марыя.

На першым этапе праекта яго арганізатары правялі трэнінгі, якія вучаць ставіць мэты, матываваць да дзеяння, планаваць працоўны дзень. Другі этап уяўляе сабой кірмаш прафесій і праграму Job shadow. Што гэта такое? У адпаведнасці з абранымі кірункамі спецыяльнасцяў быў складзены спіс арганізацый і прадпрыемстваў. Наведаўшы іх, удзельнікі праекта змаглі паназіраць за прафесіяналамі, задаць ім усе хвалюючыя пытанні, убачыць, з чым прыйдзецца сутыкнуцца ў будучыні. Напрыклад, юныя журналісты наведалі рэдакцыі мясцовага тэлебачання і «Маладзечанскай газеты». Хтосьці сустрэўся з псіхолагам, іншыя прымерылі форму пажарных-ратавальнікаў. Па завяршэнні праекта быў арганізаваны круглы стол. Хлопцы і дзяўчаты падзяліліся сваімі ўражаннямі і нарэшце вырашылі, ці варта звязваць сваё жыццё з абранай прафесіяй.

Усё больш і больш падлеткаў цікавіцца клубам ЮНЕСКА «Планета». Энергічныя, жыццярадасныя, таварыскія — яны робяць дзейнасць арганізацыі больш яркай і цікавай, дадаюць у яе штосьці ад сябе.

Арына ВЯРХОЎСКАЯ, вучаніца 10 класа гімназіі — каледжа мастацтваў г. Маладзечна.

❍ ПРА АЎТАРА

На працягу 10 гадоў Арына займаецца харэаграфіяй. З'яўляецца членам клуба ЮНЕСКА «Планета».

— Менавіта тут я навучылася праводзіць трэнінгавыя заняткі, змагла паўдзельнічаць у розных акцыях, пабывала на фестывалях клубаў ЮНЕСКА, — кажа пра сябе 15-гадовая аўтарка.

Дзяўчына цікавіцца гісторыяй. «Упэўнена, што адукаваным чалавек можа лічыцца толькі тады, калі ён ведае і паважае гісторыю сваёй дзяржавы». Арына любіць падарожнічаць па розных краінах і знаёміцца з культурай і традыцыямі іншых народаў. Таксама цікавіцца журналістыкай і ў далейшым хоча звязаць сваё жыццё менавіта з ёй. Займаецца ў гуртку «Школа журналістыкі» і ў дзіцячай тэлевізійнай студыі.

ЯНЫ ДАПАМАГАЮЦЬ «УКЛЮЧАЦЬ» ІМЁНЫ

Маладая журналістка Кацярына СІНЮК дагэтуль часта ўспамінае гісторыю пра лёс дзяўчыны, якая вырашыла перад вяселлем зрабіць аперацыю па змене прыкусу. Вельмі ўжо хацелася быць прыгожай на фота! Здавалася б, звычайная працэдура, але нешта пайшло не так, і нявеста ўпала ў кому. Дзяўчына ляжала дома, не падаючы прыкмет жыцця, яе з цяжкасцю даглядала старэнькая маці. Калі Кацярына напісала пра гэта, нераўнадушныя сталі прывозіць памперсы, прадукты харчавання. А праз некалькі тыдняў усе аб ёй забыліся... Але ж у такой сітуацыі дапамога неабходная пастаянна. Як і ў выпадку з Ігарам, які, будучы паралізаваны, восем гадоў жыў адзін у кватэры ў цэнтры горада! Усе былі настолькі занятыя сваімі справамі, што ніхто нават не падазраваў аб становішчы гэтага чалавека. Ён зусім не мог сябе даглядаць і меў патрэбу ў дапамозе сясцёр міласэрнасці з «патранажнай службы».

І тады Кацярына задумалася: як зрабіць так, каб людзі маглі не толькі даведацца пра нейкую праблему і абурыцца, але і паўдзельнічаць у яе вырашэнні. «Я пачала шукаць адказ на пытанне, як можна злучыць журналістыку з нейкай сілай, якая на пастаяннай аснове магла б займацца сістэмнай дапамогай», — успамінае дзяўчына. Так нарадзілася ідэя стварэння дабрачыннай платформы.

Спачатку гэта быў проста часопіс «Імёны», што асвятляў вострыя сацыяльныя пытанні. Але цяпер акрамя рэдакцыі тут ёсць і праектны аддзел, які займаецца прыцягненнем грамадскага фінансавання да вырашэння розных праблем, а з канца 2017 года збірае ахвяраванні і ад бізнес-кампаній. Любы ахвотны можа зрабіць не толькі рэпост у сацыяльнай сетцы, але і аказаць падтрымку канкрэтным людзям і праектам. У артыкулах «Імёнаў» ёсць кнопка «Дапамагчы», націскаючы якую чалавек робіць грашовы перавод. Напрыклад, любы можа паўдзельнічаць у тым, каб наняць няню для дзяцей у бальніцах, якія з розных прычын засталіся без бацькоў. Гэты праект Чырвонага Крыжа пачынаўся ў 2016 годзе з аднаго такога работніка ў гродзенскай бальніцы, а цяпер ім ахоплены чатыры вобласці і сталіца. У фінансаванні «Няняў» паўдзельнічала ўжо больш за тысячу чалавек.

— Летась, у кастрычніку, упершыню ў Беларусі быў запушчаны першы дабрачынны сэрвіс падпіскі. «Мы далі магчымасць ахвотным не толькі разава рабіць перавод, але і падпісвацца на аўтаматычнае спісанне са сваёй карткі любой сумы штомесяц. Бо многія праекты, такія як «Няня замест мамы», павінны функцыянаваць стабільна. Валанцёры — вельмі патрэбныя і важныя людзі ў кожнай справе, але абавязкова павінен існаваць касцяк, каманда, якая будзе працаваць пастаянна і атрымліваць аплату за гэта, — тлумачыць журналіст.

Праз два гады існавання платформы «Імёны» лічбы кажуць самі за сябе. За гэты час больш за 30 тысяч чалавек адгукнулася і падтрымалі каля 25 праектаў. Сабраная сума ў 400 тысяч долараў — рэкордная для дабрачыннага краўдфандынгу. Адсюль і назва праекта. За рашэннем кожнай праблемы стаіць канкрэтны чалавек. «Імёны» — гісторыі, лёсы і ўчынкі беларусаў.

— У сябе на пляцоўцы мы збіраем грамадскія арганізацыі, кожная з якіх працуе з рознай мэтавай групай. Іх профіль — ад школы для людзей, што перажылі трансплантацыю, да сталовай для бяздомных і дапамогі жанчынам і дзецям, пацярпелым ад гвалту. Для нас усе праекты важныя. Але мы фінансуем тыя, якія дапамагаюць не камусьці аднаму, а многім. Напрыклад, збіраем сродкі не для кожнага асобнага хворага дзіцяці з рэдкім нервова-мышачным захворваннем, а на дзейнасць арганізацыі, якая будзе штодня займацца праблемамі такіх хворых, а менавіта фонду «Геном», у якога сёння больш за 70 падапечных дзяцей і дарослых, — гаворыць Кацярына.

Можна пералічыць праекты, у якіх удзельнічала больш за ўсё ахвотных: «Няня замест мамы», выязная служба дзіцячага хоспіса, пошукавы атрад «Анёл», дыстанцыйнае навучанне інвалідаў. Апошнюю ініцыятыву стварыў паралізаваны хлопец з Барысава. Ён навучыўся кіраваць камп'ютарам пры дапамозе голасу, і цяпер дапамагае такім жа, як сам. Яму прыйшло ўжо больш за 500 заявак для навучання ў гэтай школе. Ёсць праект IT-курсаў для дзяцей з прытулкаў Мінска, куды прыходзяць выкладчыкі і дапамагаюць рабіць сайты, асвойваць новыя тэхналогіі. На чарзе — не менш за дзесяць іншых буйных праектаў.

Каб выказаць валанцёрам падзяку за дапамогу, ім дораць выключальнікі, зробленыя рукамі слабавідушчых людзей на маладзечанскім заводзе. Іх афармляюць у выглядзе магнітаў на халадзільнік, а дызайнеры наносяць надпіс «Імёны». Называецца падарунак «Уключальнік Імёнаў».

Надзея БОБРЫК, вучаніца 11 класа гімназіі № 7 г. Маладзечна.

❍ ПРА АЎТАРА

— Мая бабуля працавала ў рэдакцыі газеты «Светлы шлях» на пасадзе рэдактара аддзела праграмы «Смаргонскае радыё». Яе брат быў загадчыкам аддзела сельскай гаспадаркі газеты «Святло камунізму» (цяпер «Маладзечанская газета»). Я рыхтуюся працягваць сямейную дынастыю, — падзялілася сваімі планамі аўтарка. — Па сваёй натуры я актыўны і творчы чалавек. Мне падабаецца гэты асаблівы рытм жыцця: сустракацца з новымі цікавымі людзьмі, знаходзіцца ў курсе ўсяго таго, што адбываецца, даведвацца першай аб падзеях і здарэннях. Гэта цікавая і творчая прафесія, якая дае магчымасць падарожнічаць, адкрываць свет для сябе і іншых.

На творчым рахунку Надзеі — тры апублікаваныя ў рамках сёлетняга конкурсу работы.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
7 06 2018 г.

Субкультура

ЯК МЫ КАПАЛІСЯ Ў... СМЕТНІЦАХ,

ці Што такое фрыганства

Не, рабілася гэта не ад кепскага існавання. Проста так мы вырашылі на адзін дзень падтрымаць фрыганізм. Гэта стыль існавання, які адмаўляе прынцыпы спажывання. Яго прыхільнікі абмяжоўваюць свой удзел у традыцыйным эканамічным жыцці. А крыніцай прадуктаў харчавання і іншых матэрыяльных дабротаў для фрыганаў становяцца звалкі, смеццевыя кантэйнеры і г. д.

З Фёдарам і яго сябрамі Ігарам і Ангелінай сутракаемся ў метро. Для параўнання спачатку едзем у самы багаты раён Мінска, а пасля — у рабочы. Што знайшлі і чаго не адшукалі — чытайце ў рэпартажы.

ПОЎДЗЕНЬ — ЧАС «НЯХЛЕБНЫ»

Спачатку (для разагрэву) героі вядуць нас у найбольш «урадлівае» для фрыганаў месца — на задворкі ўніверсама, што на Нямізе. Пакуль рушым, Фёдар расказвае пра малапапулярны ў Беларусі занятак.

— Наш рух выцякае з субкультуры панк-хардкор. З цягам часу, калі паглыбляешся ў яе, разумееш, што можаш фрыганіць, катацца аўтастопам... Адкрываеш для сябе заняткі, якія дапамагаюць жыць бюджэтна. Я назваў бы гэта «цікавым жыццём для «бічоў». Да таго ж гэта выклік капіталізму, ты змагаешся з сістэмай — гэта крута, — рэзюмуе Фёдар, які фрыганіць ужо тры гады.

Хлопец расказвае, што такі занятак у яго з'явіўся неасэнсавана. Маўляў, ідзеш па вуліцы — стаіць бутэлька з недапітай колай, ты яе дапіў проста таму, што «ты так хочаш», без аніякай «ідэалагічнай базы».

— Пасля ты даведваешся пра гіперспажыванне. Потым п'еш колу не проста таму, што не грэбуеш. А думаеш, што недапітая кола — гэта дрэнна, — разважае Фёдар, калі мы падыходзім да задворкаў універсама.

Напаўпустыя сметніцы за ім не прапаноўваюць нам нічога прыдатнага для харчавання. Ды і супрацоўнікі крамы, што выйшлі на перакур, акідваюць нас нядобрым позіркам. Нашы сябры-фрыганы аргументуюць фіяска тым, што дзённы час — самы «няхлебны». За супермаркеты мэтазгодна хадзіць па вечарах, перад закрыццём — у гэты час гандляры выкідваюць нямала прадуктаў. Едзем у элітны пасёлак, каб палепшыць настрой і выпрабаваць лёс.

У ПІЦЕРЫ — БЯСПЛАТНА ЖЫЦЬ?

Па дарозе пытаем у спадарожнікаў, чым беларускі антыспажывецкі рух адрозніваецца ад замежнага. У Расіі, кажуць, фрыганізм больш папулярны, чым у нас. У Маскве нават склалі карту сметніц, дзе можна рэгулярна шукаць ежу.

— Гэта горад, дзе можна выйсці на «чыстае фрыганства». Тут ты можаш пастаянна харчавацца абсалютна бясплатна. Пры гэтым будзеш есці больш якасную і дарагую ежу, чым частка з тых, хто там жыве і працуе. Гадзіну пацікуеш каля рэстарана ці фастфуда — будзе стол не горшы за разгорнутую настольніцу-самабранку, — расказвае Фёдар. — У Пецярбургу мы трапілі на «ўпіску». Вырашылі разам з гаспадарамі пафрыганіць. Пры выглядзе сметніцы каля першай жа крамы вочы разбегліся: дзясяткі вакуумных упаковак з каўбасой, якая каштуе каля 10 нашых рублёў. Пад ёй гародніна, садавіна, рыба, печыва, хлеб. Усё пратэрмінавана толькі на дзень-два. З цяжкасцю склалі здабычу ў скрыні. У наступным двары нас чакалі тыя ж прадукты, таму мы не бралі іх. Трэцяя кропка парадавала булкамі, зерневым хлебам і цэлай скрыняй бульбы і морквы. Пры ўсім жаданні не змаглі забраць усё.

У рабочым раёне мы, як свае.

Як расказаў наш праваднік, аднойчы ён знайшоў выкінутую партыю чыпсаў. Гаворыць: «Шкада, што змог толькі 40 пачкаў вынесці». Па прагнозах фрыгана, Мінск у хуткім часе наблізіцца да Масквы і Пецярбурга па гіперспажыванні. У беларускіх рэгіёнах, зразумела, фрыганізм развіты значна менш, чым у сталіцы. Магілёў, Баранавічы, кажуць нашы сябры, вылучаюцца сярод астатніх па папулярнасці руху. Дзе ёсць субкультура хардкор-панка, там ёсць і фрыганства, эпізадычнае ці рэгулярнае.

АД ІСПАНСКАГА БРЭНДА...

На «парозе» пасёлка закранулі «фрыганаўскую этыку», бо ўмяшанне ў прыватны сектар — слізкая тэма для ўдзельнікаў руху.

— Непарушэнне тэрыторыі больш актуальнае для Захаду. У нас сметніцы знаходзяцца паза дварамі, — заўважае Фёдар. — Адно з галоўных правілаў — не ламаць урны. Мы не дэстройшчыкі, прытрымліваемся толькі сваёй мэты — узяць тое, што патрэбна нам і не патрэбна іншым.

— Калі два фрыганы сустрэліся на адной сметніцы, яны будуць біцца за «нажыву» або падзеляць яе паміж сабой? — спрабуем развіць тэму этыкі ў гумарным ключы.

Нашы спадарожнікі гавораць, што такое амаль немагчыма, бо фрыганізм у нас развіты слаба — магчымасць напаткаць такога ж, як і ты, зводзіцца да нуля. Але тэарэтычна ніхто не будзе канфліктаваць. «Кожны забярэ тое, што знайшоў», — расказвае Фёдар, і мы разам з ім зазіраем у кантэйнеры з адходамі. У асноўным пуста. Сметніцы як сметніцы, золатам не акантаваныя, элітныя сыры не валяюцца. Варта адзначыць, што тут каля кожнага дома ўстаноўлены кантэйнеры для раздзельнага збору адходаў — пластыку, шкла і харчовых.

Каля кожнага дома — кантэйнеры для раздзельнага збору адходаў.

Пасля доўгіх блуканняў каля шыкоўных катэджаў знаходзім, сярод іншага, шэранькую кофту прымальнага выгляду ад іспанскага брэнда Bershka. Такая каштуе ў маркетах прыкладна 60—80 рублёў.

Злавіўшы ўдачу «за хвост», вырашылі яе не адпускаць. Праз пару дамоў ад сметніцы, дзе знайшлі кофту, натрапілі на мужчынскія джынсы ад нямецкай фірмы Hugo Boss. Нічога, што трошкі пацёртыя і памер велікаваты, — ушыецца і адрамантуецца, лічаць нашы сябры-фрыганы. Згодна з данымі афіцыйнага сайта кампаніі, самыя танныя джынсы гэтага брэнда каштуюць 125 долараў.

Накіроўваемся ў рабочы раён.

...ДА АКОННЫХ РАМ

Пакуль едзем, Фёдар расказвае, што фрыганскі рух не абмяжоўваецца вылазкамі па сметніцах.

Суразмоўнік удзельнічае ў арганізацыі мінскіх фрымаркетаў, дзе ахвотныя могуць аддаць непатрэбную рэч і ўзяць сабе тое, што ім неабходна. Неяк з сябрам зладзіў кінапаказ пра straight edje — адгалінаванне хардкор-субкультуры, якое ўзнікла як рэакцыя на сексуальную рэвалюцыю, геданізм і іншую адсутнасць стрыманасці. Гэта філасофія адмаўляе ўжыванне любых алкагольных напояў, тытуню, наркатычных рэчываў.

— Канцавы прыпынак, — кажа голас у аўтобусе. Выходзім.

У дварах мікрараёна мы ўжо не выглядаем як прышэльцы. Мінакі, убачыўшы маладых людзей, што капошацца ў сметніцах, нават вокам не вядуць у іх (наш) бок.

Тутэйшыя сметніцы не надта адрозніваюцца ад «элітных» — у асноўным у іх тыя ж бытавыя адходы, але не паўсюль прадугледжаны раздзельны іх збор.

Тут мы таксама знайшлі штонікі, але ж не Hugo Boss. Звычайныя нефірмовыя жаночыя, якія некалі былі белымі. Ангеліна забірае — памерчык што трэба.

Калі адзенне не падыходзіць, фрыганы выстаўляюць яго на фрымаркетах або аддаюць сябрам.

— Я ніколі не купляю лішніх рэчаў. Гэта лайфстайл, ярлыкі прыходзяць пасля. Спачатку ты думаеш аб супрацьпастаўленні капіталізму, потым даведваешся — нічога сабе, я, аказваецца, круты чувак — фрыган! — смяецца Фёдар.

Хлопец адзначае: тое, што яны ходзяць па сметніцах, зусім не сведчыць пра іх нізкі сацыяльны статус. Усе героі не «дзеці вуліцы» — выхадцы з сямей сярэдняга класа.

— Ёсць багатыя людзі, якія проста не любяць спажываць. Яскравы прыклад — Генры Форд, які хадзіў у старым адзенні, харчаваўся таннай ежай і не даваў шмат чаявых. Нягледзячы на тое, што ён капіталіст, ён не з'ядаў лыжку ікры, а потым выкідваў бляшанку, не, — рэзюмуе хлопец.

Паблукаўшы па сметніцах рабочага мікрараёна, мы знайшлі на задворках крамаў гнілыя гародніну і садавіну, але пабаяліся забіраць. У дваравых кантэйнерах, акрамя бытавых адходаў, заўважылі толькі драўляныя аконныя рамы — белыя і пашарпаныя, а таксама гірлянду з вялікімі лямпачкамі — невядома, працуе яна ці не. Нічога не ўзялі, бо не пярэчым прынцыпам фрыганізму (лішняга нам не патрэбна). Як вынік: 2:1. У элітным пасёлку ўзялі фірмовыя кофту і джынсы, у рабочым мікрараёне — безыменныя штаны. Але ж глабальнай розніцы, як бачым, няма. Ці проста не «рыбны дзень»?..

Дар'я СПЕВАК.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

❍ ЦІКАВА ВЕДАЦЬ

Фрыганізм пачаўся яшчэ ў сярэдзіне 1990-х. Рух прапагандуе антыспажывецкі лад жыцця, антыглабалізм і экалагічнасць.

Паводле інфармацыі Freegan.info, члены руху «выступаюць за агульнасць, шчодрасць, сацыяльны клопат, свабоду, супрацоўніцтва ў процівагу грамадству, заснаванаму на матэрыялізме, маральнай абыякавасці, канкурэнцыі, канфармізме і прагнасці».

Слова «фрыган» паходзіць ад англійскіх слоў «свабодны» і «веганскі».

Брэндавыя джынсы з элітнага пасёлка.

Чарговыя знаходкі: кофта ад Bershka і шлёпанцы.

Можна адшукаць нават тое-сёе для душы.

З нагоды

ШЛЯХ У ТЫСЯЧЫ ЛІТАР

Я шмат думаў, ці варта наогул пісаць з гэтай нагоды. Чарговы юбілей «Маладосці» — 65. Віншаванні, цёплыя словы, падзякі. Да ўласных знакавых дат я стаўлюся абыякава, але прайсці міма чужых не магу. Канешне ж, варта пісаць! Не хваласпевы, а проста адзначыць належнае, заслужанае часам і руплівай працай.

Пісаць і стаць пісьменнікам мне хацелася заўсёды. Адзначу, што юнаком, прыходзячы ў школьную бібліятэку, гартаючы там «Бярозку» і «Маладосць», я ніколі не думаў стаць аўтарам гэтых выданняў. Не ведаў яшчэ, што спачатку буду зрэдку дасылаць свае творы, а потым нават займею рэгулярную аўтарскую калонку. Мне, тады школьніку, слаба верылася ў тое, што мяне могуць недзе надрукаваць. Не тое, каб я быў ужо зусім бяздарны. Але ж мне рэальна не хапала смеласці, каб зрабіць першы крок.

Вагаўся аж да сканчэння ўніверсітэта, а рашыўся толькі, калі ўжо пайшоў на працу. Здавалася б — стаў дарослым, незалежным ва ўсіх сэнсах чалавекам, але ад дзіцячых мрояў — пісаць і публікавацца — не адступіў, не пакінуў іх у мінулым, як часцяком робяць. Купляючы чарговы свежы нумар «Маладосці», я браў яго ў рукі, адкрываў раздзел «Проза» і ўяўляў, як глядзелася б у ім мая «нятленка». Але ж у рэальнасці мае тэксты працягвалі ляжаць ці ў шуфлядах, ці ў папках камп'ютара. Смеласці па-ранейшаму не хапала, ніяк не мог адважыцца на тое, каб адаслаць што-небудзь з напісанага на рэдакцыйную пошту. Хоць, зноў жа, шмат разоў уяўляў, як раблю гэта, неаднаразова пісаў чарнавік, які потым выдаляў. Калі вы дачыталі да гэтага месца, пэўна, разумееце, куды я хілю.

Чым больш чытаў біяграфій розных празаікаў і паэтаў, тым больш разумеў, што друкавацца ў часопісах — абсалютна нармальная практыка. Пры гэтым некаторыя сусветна вядомыя літаратары, як, напрыклад, Юкіа Місіма, імкнуліся пісаць не толькі для салідных літаратурных выданняў, дзе пераважна друкуюць прызнаных аўтараў, але і для дзіцячых. Місіма друкаваўся паўсюдна, дзе толькі яму хацелася. Нават у часопісах для дзяўчынак можна адшукаць яго прозвішча. Хемінгуэй пісаў тэксты ў «Esquire» з самага першага нумара, і яму заўсёды было што сказаць. Натуральна, што яго нарыс 1936 года, які потым лёг у аснову аповесці «Стары і мора», трапіў у адмысловы нумар, дзе сабрана найлепшае за гісторыю часопіса.

У 2013 годзе, пяць гадоў таму, я, нарэшце, сабраўся з духам і цвёрда вырашыў публікавацца. Адаслаў свой першы твор, не асабліва верачы ў станоўчы адказ. Было гэта вясной, але ўжо ў ліпеньскім нумары часопіса, як падарунак да дня нараджэння, выйшла маё апавяданне «Блог». Цяпер я, канешне ж, так не пісаў бы, тым больш не друкаваў бы гэты твор. Таму залічым тую публікацыю ў якасці авансу, з прыцэлам на перспектыву і будучыню. Маўляў, можа яшчэ напіша што лепшае.

На гэтым гісторыя магла б скончыцца, калі б увосень таго ж года я не набыў кнігу «Скрозь «Маладосць»...», якая была адмыслова падрыхтавана да 60-годдзя выдання. У ёй сабраны гутаркі, разважанні, успаміны вядомых беларускіх літаратараў, якія друкаваліся і працавалі ў часопісе, а таксама дакументы — пратаколы пасяджэнняў рэдкалегіі за розныя гады. Дзякуючы ім мы можам цяпер уявіць, якім чынам на старонкі «Маладосці» траплялі творы тых, хто цяпер ужо прызнаны як класік, а тады быў яшчэ пачаткоўцам.

Кніга насамрэч унікальная для Беларусі, бо ў нашай краіне рэдка выходзяць падобныя выданні. А ў свеце такі жанр, як нон-фікшн, з'яўляецца не проста адным з самых папулярных, але і прыбытковых. На гісторыі добра зарабляюць усе, хто толькі можа. (Прыгадайце, колькі было шуміхі вакол прамінулага юбілею «Playboy», колькі было напісана пра гэты ўжо легендарны амерыканскі часопіс, які па ўсім свеце мае нацыянальныя версіі. Ды што напісалі — нават знялі серыял на аснове рэальных падзей.)

Не буду спойлерыць кнігу, адзначу толькі, што яе абавязкова варта знайсці і прачытаць, лепей нават набыць для ўласнай бібліятэкі. Такога ў Вікіпедыі дакладна не прачытаць — гэта ўжо для сапраўдных аматараў літаратуры і ўсяго, што вакол яе. І, зразумела ж, кніга матывуе, бо, не будзем крывіць душой, кожны літаратар хоча пакінуць нешта пасля сябе, хоць бы нейкую памяць. Інакш і не пісаў бы, не імкнуўся б данесці свае думкі да чытача, падзяліцца з грамадой трывогамі ды прагнозамі. Літаратар тады сапраўдны, калі ён не толькі спрабуе адказаць на выклікі рэчаіснасці, але і здольны гэтую рэчаіснасць фарміраваць, задаваць яе тон. Ну і, канешне ж, многім з нас, яшчэ маладым, хацелася б далучыцца да плеяды славутых майстроў пяра. Стаць у адзін шэраг з класікамі. Хіба не?

Гэта неверагоднае адчуванне — пісаць для часопіса, дзе некалі друкаваліся твае героі. А іх, як вядома, многа не бывае. І гэта таксама матывуе — на тваіх вачах нараджаецца і працягваецца традыцыя і пераемнасць, якой так часам не хапае беларускай справе.

Хочацца пажадаць рэдакцыі часопіса «Маладосць», каб яна яшчэ 100 гадоў цешыла нас сваёй працай. А супрацоўнікі і надалей вось так ахвотна давалі слова маладым, адкрывалі новыя імёны, вярталі з забыцця класікаў, ніколі не спыняліся на дасягнутым і заўсёды трымалі планку. Патэнцыйным жа аўтарам часопіса хочацца пажадаць смеласці, зусім крыху, роўненька каб хапіла на самы пачатак. Бо, як сцвярджаў старажытнакітайскі філосаф Лаа Цзы, «шлях у тысячу лі пачынаецца з першага кроку». І яго, безумоўна, варта зрабіць!

Канстанцін КАСЯК.

Падмосткі для юных

У ТЭАТР НЕ ГУЛЯЕМ!

Вялікая прыступка для маленькіх артыстаў

Дзіцячая музычная тэатр-студыя (ДМТС) пры Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета — з'ява ўнікальная: не кожная тэатральная пляцоўка можа пахваліцца наяўнасцю юных артыстаў. Дэбют студыі адбыўся ў сакавіку 1990 года, калі прайшоў вялікі адкрыты канцэрт у суправаджэнні сімфанічнага аркестра тэатра. А ў канцы таго ж года на суд гледачоў была прадстаўлена першая прэм'ера — мюзікл кампазітара А. Будзько «Пітэр Пэн». Гэтая работа зацвердзіла ДМТС як непасрэднага і паўнапраўнага ўдзельніка опернага дзейства.

Дзіцячы музычны тэатр-студыя — частка вялікага тэатральнага механізма. Юныя артысты ўдзельнічаюць у спектаклях, дзе па задуме рэжысёра-пастаноўшчыка, балетмайстра або самога кампазітара патрабуецца ўдзел дзіцячага хору, мімансу або танцавальнай групы. Заняткі праходзяць, як правіла, тры-чатыры разы на тыдзень, рэпетыцыі цесна звязаны з графікам салістаў і афішай Вялікага. Адзін раз у год, у пачатку тэатральнага сезона, адміністрацыя прызначае дзень, у які ўсе ахвотныя дзеці могуць паспрабаваць патрапіць у ДМТС. Абавязковыя патрабаванні для хлопчыкаў і дзяўчынак, якія хочуць звязаць сябе з нялёгкім рамяством акцёра музычнага тэатра, — гэта наяўнасць пачатковай музычнай адукацыі, артыстычнасць, пластычнасць, узрост — 7-8 гадоў.

— Студыя дапамагае дзецям раскрыцца ў першую чаргу як асобам, а потым ужо як артыстам. Тут даюць не толькі навыкі харавых спеваў і акцёрскага майстэрства, прывіваюць любоў да опернага мастацтва, але і вучаць уменню кантактаваць з равеснікамі. Я, напрыклад, была вельмі замкнутым дзіцем, але сябры, якіх набыла тут, дапамаглі мне адчуць сябе сваёй у вялікай кампаніі, — кажа Кацярына Ігнаценка, вучаніца 10 класа сталічнай гімназіі № 8.

На рахунку студыі мноства оперных спектакляў: «Чароўная флейта» Моцарта, «Кармэн» Бізэ, «Князь Ігар» Барадзіна, «Сельскі гонар» Масканьі, «Яўген Анегін», «Пікавая дама» Чайкоўскага — гэта толькі пачатак доўгага спіса дасягненняў юнай каманды. Але не толькі ў оперным дзействе ўдзельнічаюць маленькія артысты — у балетных пастаноўках «Шчаўкунок», «Эсмеральда», «Карміна Бурана» таксама задзейнічаны дзіцячы хор. Да таго ж тэатр-студыя — часты госць канцэртных праграм: дзіцячы хор пад акампанемент аркестра Вялікага тэатра выконвае розныя сусветныя творы не толькі разам са знакамітымі салістамі оперы, але і ў адзіночку. Удзельнікі студыі сваімі юнымі, але не пазбаўленымі прыгажосці галасамі літаральна «прабіваюць» велізарную залу.

Алена Сакалоўская, хормайстар студыі, Таццяна Панасюк, яе канцэртмайстар, а таксама Наталля Бараноўская і Наталля Кузьмянкова, рэжысёры тэатра оперы і балета, і салістка Вялікага Таццяна Гаўрылава — выхадцы з дзіцячай музычнай тэатр-студыі. Многія з выпускнікоў звязалі сваё жыццё з выканальніцкім мастацтвам: Іван Вабішчэвіч (больш вядомы як Дзядзька Ваня), Глеб Матвяйчук, знакамітая піяністка Марына Рамейка, якая цяпер жыве ў Германіі і дае мноства канцэртаў па ўсім свеце, джазавая вакалістка Наталля Макарава (Санкт-Пецярбург), кінаактрыса Ксенія Малахвейчук... Іх імёны на слыху, аднак мала хто ведае, што ўсе яны пачыналі свой творчы шлях з дзіцячай студыі беларускага опернага тэатра. Былыя артысты ДМТС навучаюцца не толькі ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі, але і ў Маскоўскай кансерваторыі, ды іншых замежных навучальных установах.

— Хоць нашы дзеці і ўдзельнічаюць у «дарослых» спектаклях, не выключана магчымасць пастаноўкі, дзе акцёрскі склад — толькі акцёры ДМТС, — гаворыць кіраўнік студыі з 1992 года Алена Няронская. — Усё залежыць ад рашэння мастацкага кіраўніцтва тэатра. І такія спектаклі былі: «Кот у ботах», «Пітэр Пэн»...

ДМТС можна без перабольшвання назваць першай сур'ёзнай прыступкай у жыцці для яе ўдзельнікаў. «Студыйцы — таксама артысты, толькі маленькія. Мы не гуляем у тэатр!» — не стамляецца паўтараць Алена Няронская, назіраючы за поспехамі сваіх выхаванцаў.

Настасся СУРЫНАВА,
вучаніца 10 класа
гімназіі № 8 г. Мінска.

Байка з лесу

Няўрымслівы вожык

Жыў-быў на свеце вожык.
Звалі яго Жвавы.
Прозвішча меў такое,
бо ніколі не сядзеў на месцы.
Усе бегаў туды-сюды...
Была ў яго жонка
і пяцёра дзяцей.

— Трэба пабудаваць нам жыллё, — прыдумаў аднойчы вожык.

І зноў пачаў бегаць туды-сюды, шукаючы месца для будынка.

— Навошта нам дом, добра нам і пад імхом, цёпла і суха.

Адмяніў сваё рашэнне і зноў пабег некуды.

— Трэба ўжо рыхтавацца да зімы! — аб'явіў вожык наступным разам.

І загадаў сям'і збіраць грыбы. Але не прабег і пяці крокаў, як памяняў планы.

— Дзеці, збірайце яблыкі, вунь расце дзічка.

Маленькія вожыкі ўжо накалолі на свае іголкі па яблычку, як...

— Дзеці не трэба, яны кіслыя. Лепей назбіраем чарніц ды насушым на зіму.

Не паспелі вожыкі сабраць і па слоічку ягад, як тата загадаў абкладаць сваё жыллё сухім лісцем.

— Не, не трэба! Яно яшчэ мокрае! — сказаў неўзабаве вожык.

Іду туды не ведаю куды, бяру тое не ведаю што, — нарэшце неяк прызнаўся сам галава сям'і.

— Ой, тата! — закрычаў самы малодшы з вожыкаў. — У цябе сем пятніц на тыдні.

...Так і бегае ўся сям'я за сваім бацькам і мужам. Топчуць лапкамі то туды, то сюды...

Анастасія ЯРАХНОВІЧ,
вучаніца 11 класа
гімназіі № 12 г. Мінска.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
7 06 2018 г.

SEX=БАЛЯСЫ

НЕ ТРЭБА СВІСТАЦЬ!

У Францыі прынялі закон, згодна з якім тых, хто выяўляе непажаданую ўвагу да процілеглага полу, будуць караць штрафам да 750 еўра. Ён скіраваны на тое, каб жанчыны адчувалі сябе ў бяспецы. («— Давай проста пасядзім, пап'ем гарбаткі. — Хачу сказаць, што маньяк вы так сабе».) Штрафам будуць «выхоўваць» прадстаўнікоў любога полу, хто дазволіць сабе свістаць услед, адпускаць каментарыі з сексуальным падтэкстам ці сексуальна дамагацца. Усё як быццам бы правільна, так? Толькі чаму крытыкі новага закона палічылі, што гэта пакладзе канец так званай французскай рамантыцы? («Калі не рамантызаваць казку пра Папялушку, дык гэта гісторыя пра тое, як правінцыялка ўзяла напракат дарагія шматкі і арандавала карэту, каб склеіць мясцовага мажора».) Зразумела, што прывід Харві Вайнштэйна дагэтуль блукае па планеце. І калі ён сам добраахвотна з'явіўся ў паліцыю і чакае абвінавачвання, якое можа пакінуць яго на наступныя 25 гадоў за кратамі, дык студыі Брэда Піта збіраюцца здымаць фільм пра скандал з апальным прадзюсарам. Магчыма, таму, што не ўсё так адназначна? («Да ведама. Бабы сварацца толькі з тымі, з кім хочуць потым мірыцца. Астатніх яны ігнараць».) Ды і Катрын Дэнёў раней разам з іншымі знакамітымі француженкамі выказвалася прыкладна ў такім жа ключы.

Міністр па пытаннях гендарнай роўнасці Францыі паспрабавала заспакоіць грамадскасць, маўляў, закон не закліканы пазбавіць грамадзян магчымасці фліртаваць і «забіць вобраз французскага палюбоўніка». Ён толькі дае магчымасць жанчынам або спакойна пагаджацца, або адхіляць заляцанні. («Адносіны паміж хлопцам і дзяўчынай не лічацца сур'ёзнымі, пакуль яны не пераймяную адно аднаго ў якіх-небудзь жывёл».) І зноў жа быццам усё правільна... Калі б не адно «але». («Як робяць жанчыны? «Усё! Не тэлефануй мне больш!» І — сядзяць, чакаюць!») Вы лічыце, што кожны мужчына адразу адчуе гэтую тонкую грань паміж какецтвам і адмовай? Большасць хутчэй прысвісне ад здзіўлення і... Глядзі пачатак нататак. («— Ты магла б і прабачэння папрасіць! — Увогуле, гэта ты павінен перада мной прабачацца! — Ну, добра. Прабач, што ты мяне ўкусіла».)

І не трэба смяяцца з гэтай нагоды. Шведскі парламент прыняў закон, які абавяжа грамадзян папярэдне атрымліваць згоду на секс. З мэтай змяніць характар пераследу сексуальных злачынстваў у краіне трэба будзе яўна вербальна пацвярджаць яе, гэтую самую згоду. («— А давай без прэзерватыва? — Што, проста ваду выліваць праз акно?») Або фізічна. Гэта як, рукой махнуць? («На першым спатканні трэба праяўляць сябе з самага лепшага боку, таму Зінаіда ўзяла з сабой тэрмас з баршчом».) Такім чынам Швецыя плануе стаць дзясятай краінай у Еўропе, якая прызнае секс без згоды згвалтаваннем. («— Як думаеш, калі з прэзерватывам, гэта ж не здрада, так? — Ага, а калі з глушыцелем, дык не забойства».) Пачынаючы з 1 ліпеня, калі закон уступіць у сілу, абвінаваўцам будзе дастаткова даказаць, што відавочнай згоды не было атрымана. Па папярэднім законе пракуроры абавязаныя былі знайсці прыкметы ўжывання гвалту, прымусу да сексу. («— У нас з ім выдатны секс, моцнае сяброўства, процьма рамантыкі і па гараскопу супадаем. — А «лайкі» ставіць? — ...Ты маеш рацыю, каго я падманваю...»)

Дык а як жа тая самая рамантыка, флірт? («Ды не бойся ты адносін. Калі ты бессардэчнае стварэнне, дык табе нават спадабаецца».) Памятаеце, як у Міхаіла Шуфуцінскага, што спяваў пра ноч, як у тысячы раманаў, мігценне зорак і... «Давайце, Люся, патанцуем, пагаворым пра што-небудзь, як часта, Люся, у жыцці мы рызыкуем, дык чаго ж яшчэ раз не рызыкнуць...» Вось гэта нашы людзі, пагадзіцеся! Жывыя, са сваімі эмоцыямі, «чарцянятамі» ў вачах і «тараканамі» ў галаве. («Учора муж, з'еўшы бульбачку з курачкай, салату, запіўшы яблычным кампотам з блінчыкамі, выдаў: «— Нават калі ты сыдзеш ад мяне да іншага, я ўсё роўна буду прыходзіць да вас вячэраць!»)

Таму як без інтрыгі, без прыгожых слоў? Прыгадайце фільм «Выбух з мінулага»: «— Прывітанне. — Ну прывітанне. — Ці не маглі б вы мне дапамагчы? Я згубіў недзе свой ордэн доблесці, вы яго не бачылі? — Гэта клёвы заход!» Без усяго гэтага мы ператворымся ў бяздушных робатаў. І як атрымаем тую самую згоду, калі нават увагу процілеглага полу прыцягнуць не зможам? Усё з таго ж фільма: «— А што ёй сказаць? — Скажы што-небудзь нечаканае. — Што-небудзь смешнае. — Змані, калі трэба... — Зманіць? — О, так! Хлусня можа быць найлепшай прыладай знаёмства».

Маніць, вядома, неабавязкова. А вось здзівіць, прыдумаць нешта — самае тое. Як, напрыклад, гэта нядаўна зрабіў хлопец з Гомеля, які шышкамі выклаў велізарны партрэт дзяўчыны, якая яму спадабалася. Гаварыць жа на мове заляцанняў можна неабавязкова словамі. І можа тая гамяльчанка ў адказ прысвіснула ад гэтага ўчынку? («Калі дзяўчына гаворыць вам: «Ідзі, знайдзі іншую, лепшую за мяне!» — гэта значыць, што вы павінны адказаць: «Мне ніхто не патрэбны, акрамя цябе!» А не ўцякаць з крыкам «ура!!!») Так што свіст — ён розны бывае.

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«МУЗЫКА — ГАЛОЎНАЕ Ў МАІМ ЖЫЦЦІ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

— Хто падбіраў рэпертуар на конкурсе? Ты змагла паказаць сябе ў розных вобразах...

— Гэта заслуга педагога праекта. Мне асабіста з нумароў больш за ўсё спадабалася песня «Абійми» «Акіяна Эльзы», бо яна самая душэўная. Мне здаецца, я змагла яе прачуць і перадаць пэўны настрой. У тыя моманты думала пра сваю бабулю: яна дапамагала мне, уклала сілы ў тое, каб я вырасла добрым дзіцем. Гэту песню я падарыла ёй. Хацела расчуліць бабулю.

На конкурсе Вера выконвала таксама кампазіцыі «Якім ты быў, такім ты і застаўся», «Fire To The Rain» (з рэпертуару брытанскай артысткі Адэль), «Мой родны кут» і «Зачараваная». Апошнія дзве гучалі ў дуэце з Русланам Аляхно. На памяць спявак падарыў дзяўчыне плюшавага мішку на ўдачу. Цяпер гэты талісман заўсёды з Верай.

— Што адчуваеш, калі выступаеш на сцэне?

— Стараюся максімальна адкрывацца гледачу, каб ён зразумеў сутнасць песні. Нейкага асаблівага рытуалу перад выхадам на сцэну ў мяне няма. Проста слухаю свайго педагога, запамінаю ўсе яго парады. Стараюся супакоіцца і менш дрыжаць. Часам, вядома, не хвалявацца не атрымліваецца, але я працую над гэтым.

— Які прыз атрымала за другое месца?

— Усім фіналістам выдзяляецца стыпендыя: яе будуць выплачваць штомесяц, пакуль нам не споўніцца 18 гадоў. Мне таксама падарылі гадавыя курсы вакалу ад аднаго з найлепшых педагогаў. А яшчэ мы едзем у «Артэк» — гэта вельмі круты лагер. Удзел у конкурсе даў мне шмат чаго. Я стала больш мудрай, развіла свае вакальныя даныя, завяла новыя знаёмствы. Унесла ў жыццё больш фарбаў, і мяне гэта вельмі радуе.

— Як даўно займаешся музыкай? Якая табе падабаецца найбольш?

— З шасці гадоў. Мяне заўважыла музычны педагог Дзівінскага дзіцячага дома. Пачынала я з выступленняў на ранішніках, розных святах. За 16 гадоў дакладна зразумела, што музыка — тое, да чаго ляжыць душа. Гэта самае галоўнае ў маім жыцці.

Музыка павінна адлюстроўваць твой душэўны стан — для мяне гэта поп-кірунак, такія кампазіцыі расслабляюць. Любімая спявачка — Арыяна Грандэ. Мне падабаецца яе творчасць, тое, як яна падыходзіць да справы. Гэта артыстка мяне натхняе.

— Чытала, што ты яшчэ іграеш на цымбалах. Чаму выбрала менавіта гэты інструмент?

— Усё атрымалася спантанна. Мая сяброўка пайшла ў музычную школу па класе цымбалаў, і я запісалася з ёй за кампанію. Сяброўка ў выніку заняткі кінула, а я засталася вучыцца. Не магла сысці, бо хацела развіваць свой слых. Хадзіла на цымбалы пяць гадоў, а цяпер трэці год займаюся на фартэпіяна.

— На праекце «Ты супер!» удзельнічаюць дзеці з няпростым лёсам... Ты памятаеш сваё жыццё ў сям'і, да дзіцячага дома?

— Я не хацела бы пра гэта расказваць. Навошта? Калі мне было тры гады, мае бацькі былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў, паколькі вялі няправільны лад жыцця — былі праблемы з алкаголем. Цяпер у нас усё добра, я з імі падтрымліваю адносіны.

У адным з сюжэтаў праграмы «Ты супер!» Вера казала: трапіць у дзіцячы дом — не самае жудаснае. «Калі была маленькая, вельмі крыўдзілася на бацькоў, вы проста не ўяўляеце як. Мне не хапала мамы і таты пастаянна. Цяпер я ўсё разумею і кажу сабе, што ўжо нічога не папраўіць.

Зараз тата і мама змяніліся да лепшага. У матулі новая сям'я, і, калі яна спытала, ці хачу я, каб яна мяне забрала, адказала, што не. У яе цяпер дзіця маленькае. Мама сказала, што хоча пачаць новае жыццё. Я сама хачу таго ж. Сама яго пабудую».

— Бацькі бачылі твае выступленні па тэлебачанні?

— Вядома. Яны глядзелі кожны выпуск і хварэлі за мяне. Родныя ганарацца мной.

— Хто для цябе самы блізкі чалавек?

— Я люблю ўсю сваю сям'ю: маму, тату, брата, бабулю, да якой прыязджаю на канікулы. Гэта самыя блізкія людзі для мяне і яны застануцца такімі на працягу ўсяго жыцця. Нават нягледзячы на цяжкае дзяцінства. Яшчэ вельмі люблю былога дырэктара Дзівінскага дзетдома Веру Пятроўну Пікулу. Я з ёй знаёма 10 гадоў, і ўвесь гэты час яна імкнулася даць мне самае найлепшае. Вера Пятроўна вельмі добры чалавек, я да яе прывязалася.

— Пра што марыш?

— Каб усе родныя і блізкія былі шчаслівыя і здаровыя. У маіх планах добра скончыць адзінацаты клас, здаць паспяхова ЦТ, паступіць у прэстыжны каледж ці ўніверсітэт. Буду развіваць свае вакальныя даныя і ўдасканальваецца. Пакуль не ведаю, куды паступаць. А калі вырашу, буду трымаць у тайне, бо лічу, што расказваць пра ўсе свае планы не заўсёды добра.

У школе Вера паглыблена вывучае беларускую і англійскую мовы. Сярэдні бал у дзяўчыны — 8,5.

— А які дзень для цябе самы шчаслівы?

— У кожным перыядзе майго жыцця ёсць такія дні. Вядома, момант, калі я стала фіналісткай праекта, лічу адным з самых эмацыянальных і важных, і я дагэтуль у шоку, што заняла другое месца. Хацела б падзякаваць усім гледачам, хто за мяне галасаваў, падтрымліваў, пісаў. Я ўсё чытаю, і мне вельмі прыемна.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.008.
Нумар падпісаны ў 19.30 06.06.2018 г.

■ Будзь пільны

«ШПІЁНСКІЯ» ГУЛЬНІ З КАХАНАЙ

Як з-за рэўнасці можна апынуцца на лаўцы падсудных

Судовыя эксперты падказалі, як засцерагчы сябе ад небяспекі падчас карыстання гаджэтамі.

МЯСЦОВЫ АТЭЛА

Супрацоўнікі аддзела спецыяльных і тэхнічных экспертыз упраўлення Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Віцебскай вобласці расказалі гісторыі пра тое, як раўніўцы карыстаюцца «шпіёнскімі праграмамі».

Напрыклад, адна з «ахвяр свайго ж нездаровага кахання» — 17-гадовы жыхар Новалукомля, які вучыўся ў Віцебску, пяць месяцаў шпіёніў за каханай. Для гэтага ўсталяваў на мабільны тэлефон дзяўчыны спецыяльную праграму. Купіў яе праз інтэрнэт. Яна дазваляла кантраляваць, як кажуць эксперты, персанальную інфармацыю. Ён ведаў, калі і хто «даме яго сэрца» тэлефануе, чытаў SMS-паведамленні. Паралельна атрымаў доступ да яе акаўнтаў у сацыяльных сетках. Нават дзе яна знаходзіцца — усё яму было вядома. Пра некаторыя факты расказваў знаёмым. Перыядычна раўнівец блакіраваў дзяўчыне магчымасць карыстацца смартфонам.

За такія дзеянні, а дакладна — за несанкцыянаваны доступ да інфармацыі і неправамернае атрыманне камп'ютарнай інфармацыі, «шпіён» можа быць пакараны не толькі штрафам, але і рэальным пазбаўленнем волі — да двух гадоў. Але гэтае рашэнне ўжо будзе прымаць суд.

Акрамя гэтага, правінцыйны Атэла, як высветлілася падчас следства, ноччу падпаліў кватэру, якую арандавала дзяўчына. Страту ад пажару ацанілі на суму больш за 4500 рублёў. Агонь мог бы распаўсюдзіцца і на кватэры па суседстве. Добра, што сведка пажару як толькі заўважыў агонь, хутка набраў нумар службы выратавання.

У яшчэ аднаго раўніўца з Бешанковічаў таксама «знесла дах». Ён скарыстаўся тым, што яго каханая не закрывала сваю старонку ў сацыяльнай сетцы. Пачаў перапісвацца ад яе імя, а потым наогул выдаліў акаўнт.

Эксперты раяць: калі поўнага даверу няма тым, хто можа скарыстацца тваім гаджэтам, не трэба захоўваць аўтаматычнае адкрыццё асабістых старонак у сеціве пасля таго, як захавалі пароль.

ДВУХФАКТАРНАЯ АЎТЭНТЫФІКАЦЫЯ

Наогул, з паролямі, паважаныя чытачы, жартаваць не трэба. З вашай старонкі, напрыклад «УКантакце», зладзеі могуць распаўсюджваць усё, што пажадаюць. У тым ліку файлы з забароненай інфармацыяй — інакш, для дарослых. І, пакуль ахоўнікі права не разбяруцца, першым падазраваным напачатку будзе ўладальнік старонкі, а значыць — вы.

Многія выкарыстоўваюць два-тры паролі, а бывае, наогул адзін для адкрыцця ўсіх старонак сацыяльных сетак, электроннай пошты. Спецыялісты чарговы раз нагадалі і пра тое, што існуюць базы пароляў, на якіх зарабляюць хакеры. І нават з-за акіяна незнаёмыя вам людзі могуць падабраць паролі і даставіць шмат непрыемнасцяў. Вы гэта адчуеце, калі аднойчы, напрыклад не атрымаецца ўвайсці ў сваю паштовую скрыню.

Дарэчы, паролі трэба змяняць як мага часцей. Каб не забыцца, запісваць іх у нататнік. І, зразумела ж, нікому паказваць іх нельга.

А яшчэ эксперты раяць скарыстацца магчымасцю двайной абароны ад узлому пароляў або, інакш кажучы, двухфактарнай аўтэнтыфікацыі. Трэба «прывязаць» уваходы ў пошту, на свае старонкі ў сацыяльных сетках да мабільнага тэлефона.

Можна падстрахавацца і так: інфармацыя аб спробе ўваходу ў пошту будзе перадавацца на іншы адрас электроннай пошты.

УНІВЕРСАЛЬНЫЯ СПЕЦЫЯЛІСТЫ

Супрацоўнікі аддзела, як той казаў, — «штучны тавар». Сёння тут працуюць 10 чалавек. Сярод задач, якія яны выконваюць, правядзенне тэхнічных экспертыз радыёэлектронных прылад, выманне інфармацыі з носьбітаў электроннай інфармацыі. Плюс выязджаюць на месцы злачынстваў, дзе патрабуецца іх кансультацыя, яшчэ яны — спецыялісты на судовых працэсах. Супрацоўнічаюць з праваахоўнікамі: Следчым камітэтам, МУС, пагранічнай службай...

Усё больш прыкладаў, калі эксперты дапамагаюць змагацца з распаўсюджваннем наркотыкаў, бо перапіска паміж зладзеямі, якія гэтым займаюцца, часта вядзецца ў сеціве.

Тэхнічнае забеспячэнне ў аддзеле — па апошнім слове тэхнікі. Напрыклад, ёсць апаратура ізраільскай вытворчасці. Яна распрацавана для выкарыстання ў палявых умовах. Такую ў нашай краіне можна на пальцах пералічыць. Знешне — маленькая прамавугольная «скрынка». Але менавіта дзякуючы ёй можна «залезці ўнутр» гаджэтаў: мабільнікаў, планшэтаў і іншых сродкаў камунікацыі. І там праглядзець неабходныя файлы з тэкстамі, фота, вызначыць, што было адпраўлена па электроннай пошце, якія сайты наведваліся і гэтак далей.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Фота Аляксея СПАТКАЯ.

«Увага: цягнік адпраўляецца»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Увогуле, транспартнай міліцыі даводзіцца няпроста. Балазе, як расказаў **начальнік аддзялення аховы правапарадку і прафілактыкі Мінскага АУС на транспарце падпалкоўнік міліцыі Аляксандр КАРПОВІЧ,** дапамагаюць добраахвотныя дружыны. Гэта дазваляе павялічваць шчыльнасць нарадаў, якія патрулююць тэрыторыю вакзала. Акрамя гэтага, супрацоўнікі міліцыі кантралююць і іншыя станцыі і платформы, а таксама выбарачна суправаджаюць цягнікі. У адзін з вечароў мы і склалі ім кампанію.

Да моманту адкрыцця дзвярэй на пероне ўжо збіраюцца людзі. Сёння наш шлях ляжыць у бок Маладзечна. У гэтым кірунку нямала дачных кааператываў, ды і самі маладзечанцы нярэдка ездзяць у сталіцу на працу. Першымі ў вагон, нягледзячы на цяжкія каляскі, літаральна забягаюць дачніцы, якія цалкам адпавядаюць усім стэрэатыпам. Хоць за акном і спякота, перш за ўсё яны пачынаюць абмяркоўваць, хто б дапамог ім зачыніць вокны. Паступова вагон запаўняецца людзьмі. Самых прывабных месцаў — каля акна і па ходзе руху цягніка — за лічаныя хвіліны практычна не застаецца. Усе імкнуцца ўладкавацца зручней, таму рэчы закідваюць на паліцы. Тым часам у электрычку загружаецца вясёлая кампанія з веласіпедамі, што, вядома ж, выклікае некалькі непахвальных каментарыяў, маўляў, людзям няма куды падзецца. Але наогул ніякага парушэння ў гэтым няма, галоўнае — білет не толькі сабе, але і свайму «жалезнаму каню». Ужо перад закрыццём дзвярэй у вагон забягае мама з трыма дзецьмі дашкольнага ўзросту, каляскай і шматлікімі пакетамі. Насустрач ёй тут жа падхопліваецца некалькі маладых людзей — саступіць месца. А яшчэ кажуць: моладзь не спагадная. А вось мужчыны як селі, так і працягваюць сядзець, знарок прыкрыўшы вочы ці захоплена ўчытваючыся ў газету. Будзем лічыць, што ў іх быў вельмі цяжкі працоўны дзень.

ПРОСТЫЯ ПРАВІЛЫ

Разам з супрацоўнікамі міліцыі мы адпраўляемся па вагонах. Па словах Аляксандра Карповіча, звычайна маршруты выбіраюцца наступным чынам: цягнікі ў другой палове дня, кірункі, на якіх нядаўна адбылося правапарушэнне, а таксама тыя, што ідуць да папулярных зон адпачынку або ад іх. Акрамя таго, міліцыянеры часта суправаджаюць саставы, дзе едуць шмат футбольных фанатаў. У перыяд правядзення чэмпіянату свету па футболе ў Расіі, які пройдзе з сярэдзіны чэрвеня па сярэдзіну ліпеня, супрацоўнікі беларускай міліцыі будуць суправаджаць балельшчыкаў па тэрыторыі нашай краіны. Чакаецца, што іх будзе шмат, бо нядаўна Беларусь і Расія падпісалі пагадненне аб узаемным прызнанні віз.

Прысутнасць супрацоўнікаў міліцыі ў цягніку, з аднаго боку, аўтаматычна прымушае пасажыраў паводзіць сябе больш стрымана, з другога — дазваляе адчуваць сябе больш бяспечна. Вынік іх наяўнасці — у саставах, якія ідуць з суправаджэннем, не было зарэгістравана ніводнага злачынства. У цэлым абстаноўку ў транспарце, у адрозненне ад праслаўтых 90-х, можна назваць цалкам спакойнай. Адзінае, што можа пацягнуць за сабой праблемы, — распіццё спіртных напояў і банальная непамятлівасць. Забываюць усё: ад сумак да кашалькоў і мабільных тэлефонаў. Адзін мужчына нават звярнуўся ў аддзяленне з-за таго, што забыўся пірожныя. Вось гэта любоў да салодкага!

І ўсё ж самае распаўсюджанае правапарушэнне ў транспарце, якое істотна «апярэджвае» ўсе іншыя, — крадзяжы. Асноўных сцэнарыяў два: чалавек адлучаецца ў туалет, пакідаючы рэчы без нагляду або «пад наглядам» незнаёмца, ці моцна засынае, у той час як злачынцы і не думаюць драмаць. У любым выпадку асабістыя рэчы лепш не выпускаць з рук ці хоць бы з поля вашага зроку. Ахвярамі зладзеяў нярэдка становяцца і асобы ў стане «расслабленасці». Часта яны знаходзяць сабе новых сяброў у цягніку і пачынаюць распіваць з імі спіртное. Дрэнныя наступствы ў гэтым выпадку можна назваць заканамернасцю. Наогул, нецвярозым пасажырам супрацоўнікі чыгункі маюць права адмовіць у праездзе, прычым білет у гэтым выпадку здаць будзе нельга. Буяных могуць высадзіць на бліжняй станцыі. Гэта робіцца, перш за ўсё, дзеля іх бяспекі, бо менавіта яны становяцца самымі лёгкімі ахвярамі для махляроў, а таксама могуць атрымаць траўмы, а на чыгунцы гэта вельмі небяспечна.

З ЦУДА-ПРЫЛАДАМІ І МУЗЫКАЙ!

Пакуль мы праходзім па вагонах, усё здаецца спакойным. Хутчэй за ўсё, «весялосць» пачнецца бліжэй да ночы. Зайшоўшы ў адзін з тамбураў, сустракаемся з маладым чалавекам, які мне ў руках цыгарэтны пачак. Пры нашым з'яўленні паспешліва хавае яго ў кішэню.

— Курэнне ў неўстаноўленых месцах — сапраўдны біч сярод пасажыраў цягнікоў. Курыць у тамбурах забаронена! У міжрэгіянальных і міжнародных цягніках часцей за ўсё ёсць спецыяльна адведзеныя для гэтага месцы, акрамя таго, яны ёсць на станцыях. У электрычках іх няма, але і час руху ў іх не такі вялікі, каб не было магчымасці вытрымаць. Тым больш што плата за адну цыгарэтку занадта высокая: санкцыя артыкула 17.9 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях Беларусі — штраф у памеры да чатырох базавых велічынь. Сёння гэта каля 100 рублёў, — растлумачыў **намеснік начальніка Мінскага АУС на транспарце па ідэалагічнай рабоце і кадравым забеспячэнні маёр міліцыі Дзмітрый МІХАЛЕВІЧ.**

А вось што датычыцца незаконнага гандлю ў цягніках, то пачатак адміністрацыйнага працэсу ў сувязі з гэтым у кампетэнцыю міліцыі не ўваходзіць. Супрацоўнікі могуць толькі зарэгістраваць парушальнікаў, а потым накіраваць гэтыя даныя ў адпаведныя органы. Дарэчы, яны часта выступаюць ініцыятарамі рэйдаў, падчас якіх праваабаронцы забяспечваюць ахову грамадскага парадку. Здавалася б, продаж у электрычках даўно павінен быў знікнуць як від бізнесу. Так, беляшы ці танныя дэтэктывы вы зараз наўрад ці знойдзеце, а вось розныя дачныя цуда-прылады — калі ласка, на любы густ. Прычым здаецца, што гандляры валодаюць нейкім дарам пераканання: нават калі ў цябе няма лецішча, здаецца, што менавіта гэтыя гумавыя пальчаткі табе жыццёва неабходны. Акрамя ўражальнай маркетынгавай кампаніі гандляроў захавалася яшчэ адна даўняя забаўка — песні пад баян і гітару. На хвілінку нават здаецца, што едзеш не эканомкласам, а ў сапраўдным прэміуме: жывая музыка як ніяк!

Тым часам наша патруляванне працягваецца. Дарэчы, у абавязкі супрацоўнікаў, апроч іншага, уваходзіць праверка кнопак выкліку міліцыі, якія на самай справе звязваюць з машыністам, а ён ужо дзейнічае ў залежнасці ад сітуацыі, а таксама кантроль за інфармацыйнай прафілактыкай. Так, тымі самымі паведамленнямі, у якіх не рэкамендуюць пакідаць рэчы без нагляду і распіваць спіртное з незнаёмцамі. Дарэчы, вельмі каштоўныя парады.

А наогул электрычкі нагадваюць месца, дзе час спыніўся. Атмасфера, якая была 10 і 20 гадоў таму, такой і засталася. Хіба што стала значна спакайней.

Дар'я КАСКО.

Извещение о проведении 19 июня 2018 года повторных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Белметалл»

Предмет торгов № 1
открытый склад №1 (инв. № в ЕГРНИ 110/С-62149, площадь – 8916,3 кв. м); магазин автозапчастей (инв. № в ЕГРНИ 110/С-86092, площадь – 98,8 кв. м); туалет (инв. № в ЕГРНИ 110/С-99800, площадь – 28,6 кв. м); пост охраны (инв. № в ЕГРНИ 110/С-99750, площадь – 7,7 кв. м); торговые павильоны (инв. № в ЕГРНИ 110/С-100114, площадь – 345,8 кв. м)
Местонахождение – Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18В
Сведения о земельных участках: участок площадью 2,4570 га с кадастровым номером 141000000001003135; участок площадью 0,0137 га с кадастровым номером 141000000001003136
Начальная цена – 365 350,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка – 36 500,00 белорусских рублей
Предмет торгов № 2
цех услуг (инв. № в ЕГРНИ 110/С-86090, площадь – 649,6 кв. м); туалет (инв. № в ЕГРНИ 110/С-99715, площадь – 1,5 кв. м)
Местонахождение – Брестская обл., г. Барановичи, ул. Слонимское Шоссе, 18Г
Площадь земельного участка – 0,4034 га, кадастровый номер 141000000001003133
Начальная цена – 54 965,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка – 5 400,00 белорусских рублей
Предмет торгов № 3
склад № 3 (инв. № в ЕГРНИ 240/С-29340, площадь – 359 кв. м); здание склада № 5 (инв. № в ЕГРНИ 240/С-27903, площадь – 351,9 кв. м)
Местонахождение – г. Орша, ул. Доминиканская, 42
Площадь земельного участка – 0,3257 га, кадастровый номер 223650100001015170
Начальная цена – 46 668,00 бел. руб. без учета НДС
Сумма задатка – 4 660,00 белорусских рублей

Продавец имущества – ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», пр. Партизанский, 174, к. 301, 220075, г. Минск.

Организатор торгов – государственное предприятие «МГЦН», ул. К. Маркса, 39, к. 10, 220030, г. Минск.

Условие торгов – победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст. ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка (задатков); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также при необходимости иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет государственного предприятия «МГЦН» № BY34 BPSB 3012 1049 7101 9933 0000 в Региональной дирекции № 700 по г. Минску и Минской области ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 190398583 не позднее окончания срока приема документов на участие в торгах.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и не включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения за организацию и проведение торгов и подписывается в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи. По согласованию с продавцом возможна рассрочка платежа.

Торги проводятся 19 июня 2018 года в 10.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 07.06.2018 по 15.06.2018 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6.

Телефоны для справок:
(017) 327-48-36 (государственное предприятие «МГЦН»);
(017) 344-87-72, (029) 138-59-31 (ОАО «БЕЛМЕТАЛЛ»).

ООО «Расантехторг» (организатор аукциона) проводит 09.07.2018 г. торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) по продаже имущества ОДО «Паркинг» (продавец)

Сведения о предмете электронных торгов: Капитальное строение с инвентарным номером 500/С-56913, площадью – 134,0 кв. м, назначение – помещение неустановленного назначения.

Дата проведения электронных торгов: 09.07.2018 года.

Место нахождения предмета электронных торгов: г. Минск, ул. Немига, 3А.

Начальная цена предмета электронных торгов: 160 600 руб. 00 коп., без НДС.

Шаг аукциона: 5 % – 8 030 руб. 00 коп.

Сумма задатка: 10 % – 16 060 руб. 00 коп.

Срок экспозиции: 30 (тридцать) календарных дней.

Сумма затрат Поверенного по организации и проведению электронных торгов: 100 руб. 00 коп. – стоимость проведения электронных торгов на электронной площадке www.torgi24.by согласно прейскуранту ООО «Расантехторг» на услуги.

Расчетный счет для перечисления суммы задатка: р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код. UNBSBY2X, г. Минск, пр. Победителей, 23/3, УНП 191514793.

Торги в электронной форме в процедурах экономической несостоятельности (банкротства) (далее – электронные торги) будут проведены 09.07.2018 г. в 9.00, на электронной торговой площадке WWW.TORGI24.BY, окончание – 09.07.2018 г. в 17.00. Дополнительную информацию по участию в электронных торгах можно получить по тел. (8 029) 6703084, WWW.TORGI24.BY. Дополнительную информацию по лоту: продавец в лице антикризисного управляющего ООО «Лигал Консалт» – директора Савченко Е. А., тел. (8 029) 7795659.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в электронных торгах указан в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора электронных торгов ООО «Расантехторг» – WWW.TORGI24.BY. Заявление (регистрация) на участие, необходимые документы и задаток в размере 10 % по лоту принимаются по 06.07.2018 г.

Извещение о проведении аукциона	
Организатор аукциона	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б
Продавец	СООО «Белавтотранзит», г. Минск, пр. Победителей, 31-1
Предмет аукциона	
Месторасположение предмета аукциона: г. Брест, ул. Писателя Смирнова	

Наименование	Назначение	Общ. пл.	Инв. номер
Контора	Здание административно-хозяйственное	273,0 кв. м	100/С-60213
Здание склада	Здание специализир. складов, торговых баз, баз материально-технич. снабжения, хранилищ	1325,1 кв. м	100/С-47349
Котельная	Здание специализир. иного назначения	35,8 кв. м	100/С-47347
Гаражи	Здание специализир. автомоб. транспорта	568,7 кв. м	100/С-60212

Составные части и принадлежности: три забора, ворота

Имущество, входящее в состав лота: **асфальтированная площадка** 4 600 кв. м, **две металлические емкости** по 6 куб. м, **стоянка для автомобилей** 140 кв. м, **дорожка тротуарная с бордюрным камнем** 39 кв. м

Сведения о земельном участке: пл. **0,6789** га, предоставлен продавцу на праве аренды сроком по 12.07.2050 для размещения объектов иного назначения

Начальная цена с НДС 20 % – 762 343,61 бел. руб.

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

Срок подписания договора купли-продажи	**15** рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета аукциона

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.cpo.by

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время проведения аукциона	12.07.2018 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка»
Дата и время окончания приема документов	10.07.2018 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, оф. 4б, ООО «ИПМ-Консалт оценка»

Контактные телефоны: +375 17 280-24-41; +375 29 317-95-42.
Email: auction@ipmconsult.by

Дещенский сельский исполнительный комитет Узденского района Минской области 12 июля 2018 года по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет председателя (2-й этаж, кабинет № 1), в 10.00 проводит открытый аукцион по продаже земельных участков в частную собственность граждан для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Продавец	Местонахождение участка	S (га)	Кадастровый номер	Начальная цена, руб.	Расходы по подготовке, руб.
Лот № 1	Дещенский сельисполком	д. Городище, ул. Центральная, уч. 10А	0,1500	625680215801000166	9000,00	1364,61 + расходы на публикацию
Лот № 2	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Окружная, уч. 36	0,1454	625680202201000296	10000,00	1228,72 + расходы на публикацию
Лот № 3	Дещенский сельисполком	д. Володьки, ул. Окружная, уч. 37	0,1057	625680202201000298	9000,00	1139,23 + расходы на публикацию
Лот № 4	Дещенский сельисполком	д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. 41	0,1500	625680211801000081	8000,00	1179,28 + расходы на публикацию
Лот № 5	Дещенский сельисполком	д. Рябиновка, ул. Рябиновая, уч. 43	0,1500	625680211801000079	8000,00	1179,28 + расходы на публикацию
Лот № 6	Дещенский сельисполком	д. Яченка ул. Центральная, уч. 96 «А»	0,1050	625680215801000166	5 500,00	1223,77 + расходы на публикацию

Целевое назначение участков – для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов. Имеется возможность подключения к водоснабжению (кроме лота № 1), электроснабжению, газоснабжению.

Задаток в размере **10 процентов от начальной цены** земельного участка перечисляется путем безналичных расчетов платежным поручением (квитанцией) на счет № BY47AKBB36410625001146000000 Дещенского сельского исполнительного комитета в ЦБУ № 625 филиала № 500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО AKBBBY21500, УНП 600537220, код платежа – 04901.

Граждане, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких земельных участков, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих земельных участков.

Заявления на участие в аукционе с необходимыми документами принимаются по адресу: аг. Дещенка, ул. Школьная, 5А, кабинет управляющего делами (2-й этаж), с 8.00 до 17.00 по рабочим дням по **6 июля 2018 года** включительно.

Участники аукциона должны представить следующие документы:

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков;

заверенный банком документ об оплате задатка;

копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (ксерокопия паспорта);

представителем гражданина – нотариально заверенную доверенность.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан представляют документ, удостоверяющий личность.

Заключительная регистрация – с 9.30 до 9.45 в день проведения аукциона.

Аукцион состоится по каждому лоту при наличии не менее двух участников.

